Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЖНІЎНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 147 (27757) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Як вяскоўцы выратавалі буслянят

СТАР. 6

Сямейная газета

Сітуацыя не раённага маштабу

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл КАВАЛЁЎ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар:

«Пастановай Савета Міністраў ад 31 ліпеня 2014 года №744 «Аб аплаце працы работнікаў» прадугледжана, што ў дзяржаўных арганізацыях рост намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў дапускаецца толькі пры ўмове апераджальнага росту прадукцыйнасці працы. Для выканання гэтага патрабавання неабходна пераразмеркаваць сілы ў калектывах так, каб атрымліваць максімальную аддачу ад кожнага работніка. Лічу, што прынятае рашэнне правільнае, хоць і трохі запозненае. З-за таго, што прадукцыйнасць працы ў асобныя перыяды расла павольней, чым зарплаты, доля апошніх у ВУП таксама павялічвалася. А гэта аўтаматычна прыводзіць да зніжэння канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў. Кожны з нас павінен разумець, што ўзровень яго дабрабыту можа расці толькі пры ўмове павелічэння прадукцыйнасці працы».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 07.08.2014 г.

Долар ЗША	10340,00	■
Еўра	13820,00	▼
Рас. руб.	286,50	▼
Укр. грыўня	833,87	▼

ISSN 1990 - 763X

Цераз бар'еры

Футбалісты барысаўскага БАТЭ забяспечылі нам чарговую футбольную восень

Матча ў адказ з венгерскім «Дэбрэцэнам» балельшчыкі чакалі з асаблівым імпэтам. Стаўкі былі, як ніколі, высокія: для праходу далей БАТЭ трэба было перамагаць з розніцай у два мячы. Але рэалізаваны венграмі пенальці на 20-й хвіліне значна сапсаваў пераможны настрой барысаўчан. Здаецца, толькі дзякуючы неверагоднай падтрымцы шматтысячнай «Барысаў-Арэны» беларусы яшчэ да перапынку змаглі зраўняць лік.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

■ Жніво

НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ...

Што выручае камбайнера: «Ролтан» ці ладны кавалак мяса?

Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў гаспадарцы Слуцкага раёна. На поле адкрытага акцыянернага таварыства «Вясейскі Пакроў» мы прыехалі разам са старшынёй Мінскага абкама прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Андрэем НЯКРЭВІЧАМ. Нагода для гэтага была важкая: два камбайнавыя экіпажы ў складзе Дзмітрыя Бандуры і Аляксандра Коўгана, Мацвея Горбача і Віталя Абелеца намалацілі больш як дзве тысячы збожжа кожны. А вадзіцель Мікалай Лемешаў адвёз на элеватар такую ж колькасць. Менавіта ім і ўручыў Андрэй Юзэфавіч падзячныя пісьмы галіновага прафсаюза, грашовыя прэміі, майкі і бейсболкі з сімволікай ФПБ. Разам з тым перадавікоў жніва павіншаваў і першы намеснік старшыні Слуцкага райвыканкама — начальнік управлення сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Статкевіч і ўручыў ім таксама падзякі ад імя кіраўніка раёна.

СТАР. 3

ДАРОГА ІХ МАЛАДОСЦІ

Беларускія ўдзельнікі будаўніцтва БАМа атрымалі памятныя медалі «40 гадоў Байкала-Амурскай магістралі».

— БАМ — знакавы аб'ект у гісторыі развіцця Савецкага Саюза, а цяпер і Расіі. Дзякуючы чыгуначнай магістралі адкрыўся доступ для забеспячэння прамысловага патэнцыялу Далёкага Усходу і ўсёй краіны. Зараз вядзецца рэканструкцыя магістралі, павялічыліся аб'ёмы грузаперавозак. На будучы год у планах арганізаваць студэнцкі атрад БРСМ, а таксама хочам наладзіць маршруты па наведванні памятных месцаў БАМа для людзей сталага ўзросту, — распавёў Аляксандр Сурыкаў, пасол Расіі ў Мінску.

Памятныя медалі атрымалі 30 беларускіх ветэранаў БАМа. На будоўлю чыгуначнай магістралі ехалі нават сем'ямі.

— Спачатку адбудавалі цалкам пасёлак Кунерма, а потым пераехалі ў Кічэру, — успамінаюць Пётр і Надзея Дзянішчыкавы. — Жылі там і працавалі каля 19 гадоў. Дачка дык там і засталася. Для нас будаўніцтва гэтай дарогі — наша жыццё, уся наша маладосць. Каб можна было адгарнуць старонку назад і яшчэ раз перажыць тыя імгненні, паехалі б не раздумваючы.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

■ Ва ўрадзе

НОВАЯ ЭКАНОМІКА

Поспех эканамічнага развіцця краіны будзе залежаць ад павелічэння долі прыватнай формы ўласнасці ў прамысловасці?

За паўгода эканоміка выраслa на 1,2%. Пры гэтым назіраўся апераджальны рост прадукцыйнасці працы на 3%... Учора Савет Міністраў падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за шэсць месяцаў 2014 года. Многія паказчыкі сведчаць пра добры трэнд, але нявырашаныя праблемы па-ранейшаму застаюцца. Напрыклад, па выніках студзеня—мая сфарміравалася дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў памеры 425,7 млн долараў ЗША. Але пры гэтым, з-за пагаршэння ўмоў знешнеэканамічнай дзейнасці, не атрымалася забяспечыць выкананне прагнозных заданняў па экспарце тавараў і паслуг — 98,2% пры прагнозе на I паўгоддзе 106,1-107%.

СТАЎКА НА АПК

«Папярэднія вынікі працы эканомікі за шэсць месяцаў сведчаць пра тое, што паскорыўся эканамічны рост. Прычым на здаровай, неэмісійнай аснове, — звярнуў увагу на пасяджэнні Саўміна **прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Забяспечваецца дадатнае сальда ў знешнім гандлі таварамі і паслугамі. Краіна мае дадатны баланс попыту і прапановы валюты ва ўсіх сегментах рынку (прадпрыемствы, насельніцтва, банкі). Гэта вынік велізарнай працы ўрада і Нацыянальнага банка. Зразумела, пакуль нельга назваць стан грашова-крэдытнай сферы ідэальным, але стабілізацыя забяспечана. Значна дадае сельская гаспадарка».

Прэм'ер лічыць, што аграпрамысловы комплекс краіны павінен стаць адным з галоўных драйвераў росту нацыянальнай эканомікі ў III квартале 2014 года: «У нас ёсць усе падставы паспяхова завяршыць жніво, захаваць і рацыянальна распарадзіцца атрыманым ураджаем, атрымаць прыбытак на ўкладзеныя ў сельскую гаспадарку сродкі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Для гэтага кіраўніком дзяржавы і ўрадам створаны ўсе ўмовы. Акрамя таго, сёння ёсць магчымасць вырашыць шэраг праблем галіны. У прыватнасці, за кошт прынятых кіраўніком дзяржавы ўказаў, аптымізацыі фінансавання.

НІВОДНАГА ЛІШНЯГА РУБЛЯ

«Ніхто не мае права налічыць ніводнага лішняга рубля, калі тэмп росту фонду аплаты працы вышэй за тэмпы росту прадукцыйнасці», — падкрэсліў кіраўнік урада. Паводле яго слоў, будзе правільна, калі кантраляваць гэтае пытанне будуць Камітэт дзяржаўнага кантролю і пракуратура.

«Няправільна, калі ў «ляжачых» прадпрыемствах кіраўнік атрымлівае зарплату ў 10 і больш разоў вышэйшую, чым сярэдняя па калектыве».

Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што ў Беларусі ўведзены жорсткія патрабаванні да заработнай платы і кіраўнікоў. «Вядома, няправільна, калі ў «ляжачых» прадпрыемствах кіраўнік або група кіраўнікоў атрымліваюць зарплату ў 10 і больш разоў вышэйшую, чым сярэдняя па калектыве, — сказаў ён. — Гэта бязладдзе, і такога быць не павінна». Безумоўна, такое рашэнне, па словах прэм'ера, падаецца не ўсім, аднак выконвацца яно павінна ўсімі.

Паралельна кіраўнік урада звярнуў ўвагу на неабходнасць жорсткай эканоміі сродкаў бюджэту. «Рэжым жорсткай эканоміі павінен быць рэалізаваны паўсюдна, — падкрэсліў прэм'ер. — Толькі тыя, хто стварае новыя вытворчасці, фарміруе ўмовы для росту колькасці падаткаплацельшчыкаў, могуць разлічваць на дадатковыя даходы». Пры гэтым Міхаіл Мясніковіч удакладніў, што ў цэлым сродкі на заработную плату, камунальныя плацяжы, медыкаменты, абсталяванне для аб'ектаў бюджэтнай сферы будуць выдаткаваны ў поўным аб'ёме.

СТАРУЮ ПРАДУКЦЫЮ НІХТО НЕ БЯРЭ...

Паводле слоў кіраўніка ўрада, прыватны сектар павінен не выцясняць дзяржаўны, а дапаўняць яго. «У кожным рэгіёне, міністэрстве трэба прыцягваць айчынных і замежных інвестараў у дзеючыя і новыя вытворчасці, ствараць новыя працоўныя месцы», — падкрэсліў прэм'ер. Міхаіл Мясніковіч, у прыватнасці, адзначыў, што ў першым паўгоддзі бягучага года эканоміка прырасла на 3,2 тысячы новых прыватных прадпрыемстваў, у тым ліку на 370 — у прамысловасці. Аднак, як лічыць прэм'ер, трэба яшчэ больш, паколькі ў гэтым і заключаецца новая эканоміка.

Дарэчы, сёння на долю малога і сярэдняга бізнесу прыпадае ўжо 23% ВУП, больш за 1,5 мільёна занятых, 15% экспарту тавараў (без уліку Беларускай калійнай кампаніі і Беларускай нафтавай кампаніі). Вядзецца праца па стварэнні індустрыяльных пляцовак: у Гродзенскай вобласці сфарміраваны 32 такія пляцоўкі, у Мінскай — 34. «Але вынік павінен быць больш адчувальным», — падсумаваў прэм'ер-міністр.

Яшчэ адным фактарам павышэння эфектыўнасці эканомікі Міхаіл Мясніковіч лічыць абавязковае павышэнне нашай канкурэнтаздольнасці: «Старую прадукцыю, паважаныя калегі, ніхто браць не хоча. Нават калі гэта прадукцыя ваенна-прамысловага комплексу. Толькі новыя тавары і паслугі забяспечваюць выхад на новыя і захаванне старых рынкаў».

ПЯЦІГОДКА ВЯРТАННЯ ПАЗЫК

Міністр эканомікі Мікалай СНАПКОЎ у сваім дакладзе заглянуў трошкі глыбей у эканамічную сітуацыю. «Ці ёсць у нас у прынцыпе эканамічны рост? — задаў ён сам сабе пытанне. — Па нашых ацэнках, ВУП у 2014 годзе складзе каля 74 мільярдаў долараў, у той час калі ў 2010 годзе было 55 мільярдаў. Атрымліваецца, што рост ВУП за 4 гады склаў 35%. Адназначна можна сказаць, што маштабы эканомікі павялічыліся. Іначай мы проста не змаглі б выплачваць даўгі». А гэтую пяцігодку, па словах міністра, мы жывём менавіта ва ўмовах вяртання пазык: «За 2011—2013 гады мы ўжо вярнулі 4,8 млрд долараў, што ў тры разы больш, чым у цэлым за мінулую пяцігодку. А прыцягнулі ў тры разы менш — 2,5 млрд. Усяго за 2011—2015 гады Беларусь павінна вярнуць 12,5 млрд долараў. У такіх умовах, на наш погляд, мы забяспечваем дастатковa пазітыўны эканамічны рост».

Аднак ён дасягнуты за кошт гандлю (амаль палова прыросту ВУП бягучай пяцігодкі). «Разам з тым дынамічны рост спажывання нясе рызыку, звязаную з нарошчваннем імпарту», — перасцярагае Мікалай Снапкоў. А вось уклад прамысловасці апошнім часам застаецца адмоўным. Дзяржава чакае зусім іншага. Пры гэтым без усялякіх датацый. «Дзяржаўная падтрымка і стымуляванне захаваюцца, але эканамічны сэнс іх будзе іншы. У аснове — даручэнне кіраўніка дзяржавы аб «адмове ад дзяржаўнай падтрымкі як інструмента выратавання неэфектыўных вытворчасцяў».

Увогуле, на думку міністра эканомікі, «кансервацыя сітуацыі ў дзяржаўным сектары праз нежаданне, няўменне ці немагчымасць правядзення асноўных элементаў аптымізацыі вытворчых і фінансавых працэсаў у сукупнасці з недастатковай працай рэгіёнаў па развіцці прыватнай эканомікі і фарміруе сёння невысокія тэмпы росту». Мікалай Снапкоў бачыць поспех развіцця беларускай эканомікі ў сярэднетэрміновай перспектыве ва ўзмацненні прыватнай формы ўласнасці ў сектары прамысловасці. «Гэта стане асноўным штуршком для павышэння прадукцыйнасці, узмацнення канкурэнцыі і забеспячэння стымулаў для інавацый, пра якія казаў прэм'ер-міністр. Менавіта таму ў дакладзе я рабіў ухіл на рэгіянальнае развіццё і стварэнне новых вытворчасцяў у рэгіёнах. Для дасягнення мэты трэба вырашыць наступныя задачы: развіццё канкурэнцыі, павышэнне эфектыўнасці дзяржаўных прадпрыемстваў, развіццё прыватнага сектара, забеспячэнне макраэканамічнай збалансаванасці».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

Цераз бар'еры

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У другім тайме «Дэбрэцэн» па-ранейшаму вельмі граматна адсоўваў гульню ад сваіх варот, выбудоўваючы першую лінію абароны ў сярэдзіне поля. Але «жоўта-сінія» працягвалі прэсінгаваць з флангаў. Адна з падобных атак барысаўчан і завяршылася голам Віталя Радзівонава. Аднак святкаваць выніковую перамогу было яшчэ рана. Гадзіннік сумленна адлічваў хвіліны да пачатку экстра-тайма... якога не здарылася. На перадапошняй хвіліне дадатковага часу Сяргей Крывец у верхавой барацьбе з венгерскім галкіперам забіў вырашальны гол.

Фота БЕЛТА.

Стадыён гучна вітаў трыумфатараў вечара, а футбалісты не спяшаліся пакідаць хатняе поле, атрымліваючы асалоду ад заслужанай і прыгожай перамогі. Неверагодна шчаслівым выглядаў **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ,** для якога дэбютны выхад у плэй-оф Лігі чэмпіёнаў разам са сваёй камандай стаў своеасаблівым трэнерскім атэстатам сталасці. Галоўны трэнер БАТЭ так пракаментаваў вынік паядынку: «Ключавым момантам матча лічу гол Аляксандра Валадзько. Сапернікі былі ў меншасці, а мы не часта забіваем з гульні... І той гол усяліў у хлопцаў упэўненасць. Пасля з'явілася прадчуванне, што ўсё будзе добра. Над намі быў моцны ціск, адказнасць зашкальвала. Думаю, было відаць, з якой самааддачай змагаліся хлопцы. Яны гулялі не за грошы, а за горад, краіну і прэстыж».

А вось **абаронца барысаўчан Ягор ФІЛІПЕНКА** выказаў упэўненасць, што без умяшальніцтва суддзі ў ход сустрэчы не абышлося: «Упэўнены, што Сяргей Чэрнік у тым эпізодзе згуляў чыста. Бо ён адскочыў у процілеглы бок ад таго, куды рухаўся венгерскі форвард. Вядома, можна глядзець паўторы, але з пазіцыі на полі здалося менавіта так. Добра, што гэты адзінаццаціметровы раззлаваў нас і мы па-баявому сабраліся ў другім тайме».

Дарэчы, ледзьве не апошнім з поля пайшоў **кіраўнік барысаўскага клуба Анатоль КАПСКІ.** «Гэта мой апошні сезон у БАТЭ, — заявіў пасля матча генеральны дырэктар БАТЭ. — Шчыра кажучы, я вельмі стаміўся, хачу цяпер пабыць звычайным чалавекам, балельшчыкам. Але сыходжу са спакойным сэрцам...».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

■ Парламенцкі дзённік

ІЛЬГОТНАЕ ЖЫЛЛЁ — НЕ ДЛЯ КВАТАРАНТАЎ

У Палаце прадстаўнікоў рабочая група працавала над праектам Закона «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Законапраект ужо быў прыняты ў першым чытанні. Ці не самае цікавае для шырокай аўдыторыі яго новаўвядзенне заключаецца ў тым, што цяпер за нелегальную здачу ў арэнду кватэр, пабудаваных на ільготны крэдыт, уласнікам давядзецца плаціць штраф.

— Законапраект уводзіць адміністрацыйную адказнасць за парушэнне парадку прадастаўлення ў арэнду жылых памяшканняў, пабудаваных або набытых з прыцягненнем ільготнага крэдыту, — падкрэсліў у размове з журналістамі **Уладзімір ЧАРАВАЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі ніжняй палаты беларускага парламента па заканадаўстве.**

Парламентарый заўважыў, што на практыцы часта назіраецца сітуацыя, калі людзі, атрымаўшы ільготны крэдыт, будуюць жыллё. Як толькі кватэра пабудавана, яны тут жа здаюць яе ў арэнду і, натуральна, атрымліваюць грашовую ўзнагароду. Пры гэтым самі жыллём не карыстаюцца, бо, атрымліваецца, ім і так ёсць дзе жыць. А чарга на жыллё працягвае расці.

— Каб справіцца з гэтай сітуацыяй і ўводзіцца адміністрацыйная адказнасць. У праекце закона прадугледжваецца штраф ад 4 да 30 базавых велічынь, а калі гэтае правапарушэнне на працягу года ўласнікі кватэры паўтараюць, то іх чакае новы штраф — ад 30 да 50 базавых велічынь.

Законапраект прадугледжвае сітуацыю, калі такое жыллё можа здавацца ў арэнду легальна. Для гэтага грамадзянін павінен атрымаць дазвол мясцовага выканаўчага органа.

— Але думаю, што такіх дазволаў амаль не будзе, — лічыць дэпутат. — Бо дзяржава выдае крэдыт, каб дапамагчы чалавеку. А ён, замест таго, каб карыстацца жылымі памяшканнямі, імкнецца атрымаць з іх дадатковую выгаду. Але ў нейкіх асаблівых выпадках кватэру ўсё-такі можна будзе здаць.

Пакуль што спецыяльнай адказнасці за здачу ў арэнду такіх кватэр няма. Законапраект будзе разгледжаны на восеньскай сесіі, і можна чакаць, што ён уступіць у сілу з наступнага года.

Як паведаміў Уладзімір Чаравач, сёння афіцыйнай статыстыкі, наколькі часта жыллё, пабудаванае на льготны крэдыт, здаецца ў арэнду, няма.

— Але з размовы са старшынямі жыллёвых будаўнічых спажывецкіх кааператываў (ЖБСК) становіцца вядома, што да паловы кватэр у нядаўна пабудаваных дамах здаюцца ў арэнду. Інфармацыя гэта выплывае, калі неабходна вырашыць пэўныя пытанні з уласнікамі жылля. Прыходзяць на кватэру — а там замест гаспадароў — кватаранты.

Што да таго, якім жа чынам будуць выяўляцца парушальнікі, то дэпутат упэўнены, што гэта не так цяжка — дастаткова пагаварыць са старшынямі ЖБСК, ЖЭС або нават з суседзямі.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ А не шкодзь!

«ЗАЛАТАЯ» ПЛОТКА

Амаль у 150 мільёнаў рублёў абышлася незаконная начная рыбалка на возеры Чырвонае бацьку і сыну з вёскі Ляхавічы Жыткавіцкага раёна.

— У лодцы дзяржінспектары знайшлі восем сетак даўжынёй 400 метраў. Незаконны ўлоў — 799 асобін розных відаў рыб — пацягнуў амаль на 100 кілаграмаў. Большую яго частку складалі плоткі, такса за незаконную здабычу якіх павялічылася ў пяць разоў, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.**

Сяргей РАСОЛЬКА

Утерянные представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию имущества граждан формы 2РН серии ИГ № 0413434, по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 0570255, 0569719 **считать недействительными.** УНП 100122726

Утерянный бланк страхового полиса серии НС № 0283668, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительным.** УНП 290415076

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія і шчырыя спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю БРЭМШМІТА Аляксандра Жанавіча — дырэктара ААТ «Белэкасістэма».

УНП 100519825

НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Бясспрэчна, любому чалавеку прыемна атрымліваць падарункі. Але яшчэ больш прыемна, што нашу працу заўважылі як мясцовыя ўлады, так і прафсаюзы, і ацанілі яе належным чынам, — прызналіся віноўнікі ўрачыстасці.

Мацвей Горбач і яго памочнік Віталь Абелец прыехалі на падмогу сваім калегам з суседняй гаспадаркі ААТ «Падлессе-2003», дзе ўжо закончылі ўборку.

Дзмітрый Бандура працуе ў Слуцкай ЖКГ. Але дванаццаты сезон дапамагае «Вясейскаму Пакрову» падчас уборачнай кампаніі. Як прызнаўся Дзмітрый Анатолевіч, сёлетняе жніво для яго асаблівае: нарадзіўся сын. У сям'і ўжо падрастае дачка. А тут і яшчэ адзін мужчына з'явіўся — Бажэн Дзмітрыевіч. Таму і працуе камбайнер з настроем, радасцю і натхненнем. А яшчэ жніво — гэта нагода за кароткі тэрмін значна папоўніць сямейны бюджэт. Тым больш што сёлета ўраджай, як ніколі.

— А як адзначылі з'яўленне на свет немаўляці? — пацікавілася ў свайго суразмоўцы, — мабыць, чарку разам з сябрамі паднялі за спадчынніка ды жонку?

Дзмітрый у адказ толькі ўсміхаецца: не да гэтага — жніво. Толькі прыехаў з поля ды заснуў, як сярод ночы жонка па тэлефоне паведаміла, што нарадзіла сына.

Шчаслівы бацька ледзьве дачакаўся, пакуль развіднела. А пятай раніцы ўжо быў пад вокнамі радзільні. Зразумела, ніхто яго туды не пусціў, ды і сына не ўдалося пабачыць, а вось спадарожніцы жыцця падзякаваў за такі падарунак.

У Дзмітрыя Бандуры — надзейны памочнік Аляксандр Коўган. На ўборцы хлопец трэці раз. Аляксандр сёлета закончыў Слуцкі каледж перапрацоўчай прамысловасці па спецыяльнасці інжынер-механік. Адукаваны малады чалавек — можна сказаць, з тэхнікай на «ты». У абавязкі памочніка камбайнера ўваходзіць шмат чаго, у тым ліку праверка гатоўнасці камбайна перад выхадам у поле, наяўнасці вады, паліва, нацягванне транспарцёраў, элеватараў. Ды і падчас работы ў полі не сядзіць ён у кабіне, даводзіцца часта выскокваць, каб пракантраляваць якасць уборкі: страт не павінна быць.

— Бедны, як ты вытрымліваеш такую спякоту? Дрэнна, відаць, табе, — выказала спачуванне хлопцу.

— Кабіна камбайна абсталявана кандыцыянерам, тэмпература тут камфортная — 17-20 градусаў. А калі б дрэнна было, то не пайшоў бы сюды працаваць, — сказаў як адрэзаў юнак...

Харчаванне павінна быць збалансаваным і каларыйным, уключаць у сябе і вітаміны: свежую агародніну і садавіну.

Апоўдні прыйшла машына з абедамі.

— «Ролтан» прывезлі, — пажартавала я.

Але камбайнеры ўспрынялі мой жарт усур'ёз.

— Рэкламы наглядзеліся. На тым «Ролтане» мы б ног не пацягнулі. Паглядзіце самі, чым нас кормяць, а можаце разам з намі і папалуднаваць, — запрасілі яны.

Прыродная цікаўнасць узяла верх і я зазірнула ў бакі, над якімі з апалонікам шчыравала кухарка. Салата са свежай агародніны, боршч, бульбяное пюрэ з галубцамі, на трэцяе — кампот з булачкай. Гарачае харчаванне дастаўляюць на поле спецыяльна абсталяваным транспартам два разы на дзень. Кожны раз меню рознае, не паўтараецца. Абавязковая ўмова: харчаванне павінна быць збалансаваным і каларыйным, уключаць у сябе і вітаміны: свежую агародніну і садавіну. Акрамя таго, механізатарам пастаянна выдаецца мінеральная вада.

— А вы думалі, «Ролтан» выручае, — смяецца Андрэй Някрэвіч. — Мы нават звярталіся ў адпаведнае ведамства, каб забаранілі гэтую рэкламу. Але нам адказалі, што немагчыма, бо гэты ролік расійскай вытворчасці.

У акцыянерным таварыстве ёсць свая сталовая, свае кухары, якія нават булачкі выпякаюць самі для ўдзельнікаў жніва. Прадукты купляюць мясцовыя, натуральныя, без пасярэднікаў: на слуцкіх мясакамбінаце, птушкафабрыцы, камбінаце хлебапрадуктаў. Кошт харчавання на 70% кампенсуе ўдзельнікам жніва гаспадарка. На мехдварах спецыяльна абсталяваны месца для прыёму ежы, душавая, дзе пасля работы можна памыцца, пераапрануцца. Дадам, што ў камбайнераў, вадзіцеляў прывабнае спецадзенне: стыльныя камбінезоны, бейсболкі, туфлі.

— Мы вельмі ўдзячны нашым хлопцам за добрасумленную працу. І наш абавязак стварыць для іх добрыя ўмовы, — уступае ў размову **дырэктар ААТ «Вясейскі Пакроў» Людміла САВАНОВІЧ.** — Сёлетняя ўборка нялёгкая, шмат палегліцы. Але нашы камбайнеры справіліся з пастаўленай задачай — і яе ўбралі. Усяго ж у нас 9 камбайнавых экіпажаў: усе маладыя, здаровыя, фізічна вынослівыя мужчыны. З гэтым калектывам мы працуем не першы год і, бясспрэчна, жніво ідзе да завяршэння. А ў нас, дарэчы, самая вялікая ўборачная плошча ў раёне — каля 3 тысяч гектараў.

Ураджай у «Вясейскім Пакрове» сёлета багаты, прамежкавы валавы намалот ужо склаў 11,5 тыс. тон збожжа (звесткі на 5 жніўня), сярэдняя ўраджайнасць з аднаго гектара — 45 цэнтнераў. А на асобных участках пшаніца дала па 70 ц/га. Праз дзень-другі ўборка збожжавых у гаспадарцы завершыцца.

Як адзначыў Васіль Статкевіч, у Слуцкім раёне ўраджайнасць складае 48,7 цэнтнера з гектара, што на 7,2 цэнтнера вышэй за леташнюю. 97 камбайнавых экіпажаў намалацілі больш як па тысячы тон, 12 — звыш 2 тыс. тон збожжа, неўзабаве з'явяцца і «трохтысячнікі». А завяршыць жніво на Случчыне мяркуецца да канца тыдня.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Фота Ірыны ЯНУШКЕВІЧ.



НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ДЛЯ БІРЖАВОГА ГАНДЛЮ

Біржа здолее гандляваць паслугамі?

Летась Беларуская ўніверсальная таварная біржа ініцыявала ўнясенне змен у дзейнае заканадаўства. Міністэрства гандлю да прапаноў паставілася станоўча. Новы законапраект ужо ўзгоднены з адпаведнымі органамі. Зараз яго разглядаюць ва ўрадзе.

Сярод асноўных навацый законапраекта — прадастаўленне права нерэзідэнтам ажыццяўляць брокерскую дзейнасць. Таксама мяркуецца замацаваць за біржай функцыі рэгістратара пазабіржавых здзелак.

— Інстытут біржы мы разглядаем як цэнтралізаваную крыніцу рыначнай інфармацыі, у першую чаргу што датычыць коштаў, — зазначыў **начальнік аддзела метадалогіі і перспектыўнага развіцця Беларускай універсальнай таварнай біржы Сяргей МАЙСЕЙЧЫК.** — Адпаведна, мы мусім валодаць звесткамі аб сітуацыі як у біржавым сектары, так і паза яго межамі. Прадастаўляць іх мы зможам як удзельнікам рынку, так і курыруючым органам. Калі зараз па біржавых таварах усё больш-менш адрэгулявана і каціроўкі па гэтых пазіцыях з'яўляюцца ў адкрытым доступе літаральна праз гадзіну пасля заканчэння таргоў, то ў пазабіржавым сектары пануе сапраўдны цёмны лес. Каб жа даведацца пра сітуацыю ў ім, трэба рабіць шмат запытаў у спецыяльныя інстытуты. А гэта, у сваю чаргу, аднімае шмат часу, за які інфармацыя ўжо паспее састарэць. Неабходнае праграмнае забеспячэнне намі ўжо распрацавана, цяпер яно тэсціруецца.

Яшчэ адно новаўвядзенне закона — дазволіць біржы ажыццяўляць гандаль паслугамі. Зрэшты, неабходны арганізацыйны досвед яна ўжо мае, бо летась распачаўся гандаль паслугамі па нарыхтоўцы драўніны. Гэты час быў заадно і своеасаблівым пераходным перыядам. З наступнага году магчымасці закупляць драўніну на карані больш не будзе.

— Сёння да нас звяртаюцца кліенты, якія жадаюць праводзіць таргі ў сферы IT-паслуг, — працягвае Сяргей Майсейчык. — Гэты рынак вельмі аб'ёмны, аднак, на жаль, не заўжды празрысты. І пры заказе праграмных прадуктаў у іншых арганізацыях мы сутыкаемся з вялікім роскідам цэн. Спыняцца на гэтым мы не плануем. У перспектыве аб'ектам гандлю могуць стаць у тым ліку і будаўнічыя паслугі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЯК СТАЦЬ АКУЛАЙ БІЗНЕСУ?

Вучэбна-навуковы Цэнтр сістэмных даследаванняў праблем моладзі эканамічнага факультэта БДУ аб'явіў набор у «Школу прадпрымальніцтва і менеджменту для моладзі. Уласная справа».

На навучанне запрашаюцца школьнікі, студэнты і маладыя спецыялісты. Пасля заканчэння курсу выпускнікі школы атрымаюць магчымасць выязджаць у бізнес-летнікі, удзельнічаць у чэмпіянатах па кіраўніцкіх паядынках StartUp Weekend, дзе яны змогуць знайсці патэнцыяльных інвестараў для сваіх праектаў. А найбольш перспектыўныя ідэі знойдуць падтрымку такіх бізнес-партнёраў цэнтра, як група кампаній «Прэмія», «Суполка бізнес-анёлаў і венчурных інвестараў «БАВІН», Гарадскі бізнес-інкубатар, Еўрапейскі фонд адукацыі.

Заняткі будуць праходзіць па суботах з кастрычніка па май. Пасля заканчэння навучання слухачы атрымаюць сертыфікаты БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Спажывец

НА РЫНКАХ ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАРАДАК. І КРОПКА

У ліпені кіраўніцтва міністэрстваў гандлю і аховы здароўя, Дзяржстандарта падпісалі сумесны загад аб стварэнні рабочых груп для навядзення парадку на спажывецкім рынку. І вось сталі вядомыя першыя вынікі кантрольных мерапрыемстваў, праведзеных на асноўных рынках сталіцы і сталічнай вобласці.

Гаворка ідзе пра «Ждановічы», «Чэрвеньскі рынак у Лошыцы», «Заходні», рынак у Курасоўшчыне, «Экспабел», «Чыжоўскі рынак» і іншыя. Іх уласнікі, канстатуе Міністэрства гандлю, пакуль не ў поўнай меры выконваюць патрабаванні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным рэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання ў Рэспубліцы Беларусь», які ўступіў у сілу з 22 ліпеня гэтага года.

Толькі за два дні кантралёры выдалі больш за 50 рэкамендацый па ліквідацыі парушэнняў. Найбольш нараканняў выклікала работа рынка «Лебядзіны», гандлёвага дома «Ждановічы» і гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Экспабел». Пры гэтым на кожным рынку былі выяўлены тыя ці іншыя парушэнні і недахопы (незабеспячэнне своечасовага прыбірання тэрыторыі, адсутнасць дастатковай колькасці парковачных месцаў для аўтамабіляў, парушэнне рэжыму працы, выкарыстанне няспраўных вагаў, несанкцыянаваны гандаль фізічнымі асобамі і інш.). Як паведамляе прэс-служба Мінгандлю, падобныя кантрольныя мерапрыемствы плануецца правесці і ў абласцях; а да ўласнікаў рынкаў, якія не выправяць выяўленыя парушэнні і недахопы, будуць прымяняцца самыя жорсткія меры ўздзеяння — да прыпынення дзейнасці ўказаных аб'ектаў.

Падчас маніторынгу кантралёры таксама пракансультавалі каля 200 суб'ектаў малога прадпрымальніцтва па пытаннях захавання заканадаўства аб гандлі, абароне правоў спажыўцоў, патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза і г.д.

Сяргей РАСОЛЬКА

ПРАЦА ЯК ЛАД ЖЫЦЦЯ

Сакрэтам поспеху падзяліўся дырэктар горацкага прадпрыемства «Камунальнік»

Яшчэ летась гэтае прадпрыемства было на ўліку адстаючых і стратных, а сёлета занесена на абласную Дошку гонару. Перамены адбыліся неўзабаве пасля зліцця яго з больш моцным мясцовым прадпрыемствам «Цеплаэнергетыка». Ад былога «Камунальніка» засталася толькі назва, а вось палітыка цалкам змянілася. Узначаліў рэарганізаваную структуру былы кіраўнік лідзіруючай арганізацыі Віктар ТРУХАН. За сумленную працу ён нядаўна атрымаў званне Ганаровага работніка ЖКГ.

У ЭКСТРЭМАЛЬНЫХ УМОВАХ

Камунальнікі ўвесь час нагадваюць, што насельніцтва толькі на пэўны працэнт пакрывае іх паслугі. Адкуль, маўляў, узяць сродкі на развіццё? Але Віктар Трухан падлічыў, што зарабіць грошы можна, калі зноў запусціць былы асфальтавы завод і аднавіць участак па дрэваапрацоўцы. З гэтага і пачаў сваю працу на новай пасадзе. Сёння па асфальт «Камунальніка» нават выстройваюцца чэргі: ён таннейшы, чым у будаўнічай арганізацыі. Але ў першую чаргу каштоўны матэрыял ідзе на задавальненне ўласных патрэб: добраўпарадкаванне дваравых пляцовак, абслугоўванне і будаўніцтва дарог. На балансе прадпрыемства шмат сельскіх вуліц. Тэхніка для ўкладкі асфальту таксама ёсць. Тут падлічылі, што яе танней набыць, чым карыстацца паслугамі дарожных службаў.

Не за гарамі і той час, калі пачнецца выпуск піламатэрыялаў на ўчастку, які зараз мадэрнізуецца. Ужо нават ёсць дамоўленасць па збыце прадукцыі. «Гэтыя два аб'екты стануць стабільнай крыніцай даходаў для развіцця вытворчасці», — лічыць дырэктар. Тое, што «Камунальнік» устане на ногі, ён не сумняваецца. За яго плячыма добры вопыт, некалькі гадоў таму прыходзілася літаральна з кален падымаць прадпрыемства «Цеплаэнергетыка».

— Калі я прыйшоў туды ў якасці кіраўніка, было ад чаго схапіцца за галаву— успамінае ён. — На вуліцы — зіма, а дроў няма, разрывы адзін за адным, вада цячэ ракой. Вучыўся працаваць у экстрэмальных умовах. Пасля такіх выпрабаванняў набыў усё неабходнае для выпраўлення любых няспраўнасцяў на водаправодзе ці каналізацыі. Купілі нават спецыяльныя машыны-майстэрні «Любава», абсталяваныя зварачным апаратам, міні-электрастанцыяй і іншай, вельмі неабходнай для працы ў «палявых» умовах, начынкай. Старыя водаправодныя і каналізацыйныя сеткі мяняем на новыя з высокатэхналагічнага матэрыялу.

— Што адбылося падчас рэарганізацыі прадпрыемстваў? Наколькі неабходны быў гэты працэс?

— Летась, калі нас аб'ядналі, на прадпрыемстве працавала каля 1200 чалавек. Цяпер амаль на 100 менш. Скараціўся інжынерна-тэхнічны персанал, хтосьці пайшоў на пенсію. Аўтаматызацыя працэсаў дазваляе абыходзіцца мінімальнай колькасцю чалавек. На «Цеплаэнергетыцы» яшчэ 4 гады таму ўсе каналізацыйна-помпавыя станцыі былі аўтаматызаваны, а колькасць працуючых на іх людзей скарацілася прыкладна на 40 чалавек. Мы ім прапанавалі іншую работу, хто хацеў — застаўся. На «Камунальніку» яшчэ плануецца мадэрнізацыя. Збіраемся ў бліжэйшы час цалкам зрабіць аўтаматызацыю газавых кацельняў. Людзі, якія трапяць пад скарачэнне, змогуць пайсці працаваць на ўчастак па дрэваапрацоўцы. Разглядаем магчымасць рабіць пелеты. З'ездзім у Барысаў, пацікавімся, як яны робяцца. Задавальненне не з танных, але трэба глядзець на перспектыву.

— Дзяржаўная камісія, якая працавала па праблемных пытаннях у ЖКГ, выявіла шмат балючых месцаў у сістэме. Горацкі «Камунальнік» да рэарганізацыі — жывы таму прыклад. Што, на ваш погляд, перашкаджае добра працаваць гэтай галіне?

— ЖКГ павінна займацца выключна камуналкай — абслугоўваннем жыллёвага фонду, водаадвядзеннем, водазабеспячэннем, цеплазабеспячэннем і ўтылізацыяй цвёрдых бытавых адходаў. Але так не атрымліваецца. Асфальтавы завод прыйшлося аднавіць не ад добрага жыцця. Ён нам грошы дае. Але ёсць аб'екты, якія для нас бескарысны баласт. Як, напрыклад, тая ж сушыльная станцыя, якая пакуль стаіць незапатрабаваная. Лішнія выдаткі, лішні галаўны боль.

Нічога, акрамя страт, не прыносяць і тыя больш за 700 сельскіх калодзежаў, якія трэба рамантаваць, чысціць. А за якія грошы? Тая бабулька, якая ўсё жыццё брала там ваду бясплатна, ніколі не будзе заключаць з намі дагавор і плаціць за паслугі. А калі няма дагавора, страты ніхто не возьмецца кампенсаваць.

ПРА ДРУГАСНЫЯ РЭСУРСЫ І МЕНТАЛІТЭТ

Мы прывыклі ў якасці станоўчага прыкладу прыводзіць замежныя еўрапейскія краіны з іх узорным парадкам і эфектыўнай арганізацыяй працы. Чаму б нам так не жыць?

— Мы не так мыслім, — лічыць суразмоўца. — Быў я неяк у Лейпцыгу на заводзе па перапрацоўцы бытавых адходаў. Людзі самі нясуць туды паперу, метал і іншыя другасныя матэрыялы, таму што гэта каштуе грошаў. За мяжой утылізацыя адходаў — гэта клопат вытворцаў. А ў нас камунальнікі крайнія. У Германіі разам з бутэлькай даюць жэтон: вяртаеш тару — забіраеш грошы.

— А за мяжой у ЖКГ такі ж шырокі спектр дзейнасці, як у нас?

— Аказаннем камунальных паслуг там займаюцца ў асноўным прыватнікі. У Польшчы прыходзілася бачыць, як працуе кацельня прыблізна такой магутнасці, як і ў нас. У чалавека, які ёй кіруе, іншых аб'ектаў больш няма. Там кожны займаецца чымсьці адным. Нехта прымае бытавыя адходы, хтосьці абслугоўвае смеццевы палігон, і гэтак далей. А мы адказваем за ўсё.

Нашы прыватнікі, якія спецыялізуюцца на аказанні камунальных паслуг, не прыклад для пераймання. Яны ідуць зарабляць грошы з нуляўым капіталам. Было б правільна, каб арганізацыя, якая збіраецца працаваць у нашай сістэме, мела нейкі статутны капітал. А то атрымліваецца, што прыватнік бярэ новыя дамы, «стрыжэ» грошы і нічога не ўкладвае ў справу. Я за канкурэнцыю. І за прыватную ўласнасць. Але прыватнік павінен паказаць, што абслугоўвае лепш, чым дзяржаўная служба.

— Даводзілася чуць, што ў нашай камунальнай сістэме працуюць дылетанты, а вось прафесіяналаў не хапае.

— Са спецыялістамі сапраўды праблематычна. У нас на прадпрыемстве і аграномы працуюць, і заатэхнікі, і настаўнікі, няма толькі медыкаў. Востры дэфіцыт спецыялістаў сярэдняга кіруючага звяна. Хацелася б бачыць больш высокакваліфікаваных майстроў, якія ведалі б канструктыўныя асаблівасці будынкаў, водаправод, каналізацыю. Пакуль прыходзіцца вучыць людзей на месцах. Моладзь наогул не імкнецца ў ЖКГ. Яны не прывыклі працаваць пасля пяці вечара. А ў нас ненармаваны працоўны дзень, калі нешта здарылася, трэба бегчы і ратаваць.

БУДУЧЫНЯ — ЗА ХАЎС-МАЙСТРАМІ

Хто з нас не наракаў на камунальных «афоняў», якія нічога толкам рабіць не могуць, а грошы за свае паслугі бяруць немаленькія. У Горках вырашылі пакончыць з гэтым.

— Будзем рыхтаваць хаўс-майстроў, — дзеліцца планамі Віктар Трухан. — Гэта такая прагрэсіўная форма працы, калі адзін чалавек выконвае абавязкі адразу некалькіх спецыялістаў — электрыка, маляра, тынкоўшчыка, сантэхніка... Адзін такі майстар будзе абслугоўваць каля 400 кватэр. Прынцып такі: тэлефануеш у ЖЭУ, прыходзіць наш чалавек, робіць справу, выпісвае чэк, але грошы не бярэ — разлік будзе прадстаўлены ў жыроўцы. Чым больш заявак работнік выканае, тым большы заробак атрымае. Пагадзіцеся, добры стымул.

— У савецкія часы двор жылога дома быў месцам сустрэч, дзе жыльцы адпачывалі, дыхалі свежым паветрам. А цяпер вакол адны машыны. Можа, тут таксама нешта трэба было б змяніць?

— Тое, што падмятаць і прыбіраць снег нязручна, гэта факт. Мы набылі невялічкую машыну-пыласос, якая добра ачышчае прылатковую частку дарогі, але ў нашых дварах да бардзюраў не падступіцца. Толькі куды дзенешся ад гэтых аўтапарковак? Цяпер машына не раскоша, а патрабаванне часу.

Ёсць пытанні па дзіцячых гульнявых пляцоўках. На ўстаноўку так званых дваравых атракцыёнаў выдаткоўваюцца бюджэтныя грошы, але гэтыя арэлі і альтанкі ніхто не беражэ. Магчыма, калі б жыльцы набывалі іх за свой кошт, парадку было б куды больш. Гэта ж для іх дзяцей. І наогул, было б карысна сабрацца дамавым камітэтам і абмеркаваць, што патрэбна, а без чаго можна абысціся.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

■ На вышыні

«БЕЛАВІЯ» СКАРАЮЦЦА РЭКОРДЫ

Мінулы ліпень стаў для «Белавія» рэкордным па многіх паказчыках, паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі.

Упершыню ў сваёй гісторыі «Белавія» перавысіла рубеж у 300 тысяч пасажыраў, перавезеных за месяц. Усяго авіякампанія даставіла за гэты тэрмін да месца прызначэння 303 659 чалавек, што складае 129 працэнтаў да паказчыка мінулага года за такі ж перыяд. Акрамя таго, 31 ліпеня была перавезена максімальная колькасць пасажыраў за адзін дзень за ўсю гісторыю «Белавія» — 11 061 чалавек.

А 24 ліпеня на рэйс авіякампаніі быў зарэгістраваны мільённы пасажыр. Летась мільённы рубеж «Белавія» пераадолела 16 жніўня. Усяго з пачатку года было перавезена 1 077 206 чалавек, што на 22,5 працэнта больш, чым летась за сем месяцаў.

У ліпені «Белавія» ажыццявіла 3 077 рэйсаў, у тым ліку 1 995 рэгулярных. Такі рост стаў магчымым дзякуючы гнуткай палітыцы, якую праводзяць авіякампанія і Нацыянальны аэрапорт «Мінск» па прыцягненні транзітных пасажыраў. Транзітная прыцягальнасць «Белавія» значна павялічылася пасля праведзенай рэканструкцыі сталічнага аэрапорта. Авіякампанія «Белавія» разам з Нацыянальным аэрапортам «Мінск» і мытняй «Мінск-2» распрацавалі тэхналогію абслугоўвання пасажыраў, у адпаведнасці з якой транзітныя пасажыры (з перасадкай у мінскім аэрапорце) могуць не атрымліваць багаж у Мінску.

Каб забяспечыць рост пасажырапатоку, авіяперавозчык пашырыў свой парк паветраных суднаў з пачатку года на пяць самалётаў. У чэрвені таксама быў падпісаны кантракт з карпарацыяй «Боінг — грамадзянскія самалёты» на набыццё трох новых Boeing-737/800.

30 ліпеня на сайце авіякампаніі «Белавія» з'явілася новая опцыя — продаж білетаў на рэйсы авіякампаній-партнёраў па напрамку, куды «Белавія» не выконвае прамыя рэйсы.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Добрая навіна

Выратавальная бялізна?

Мажліва. Аднак лепш у ложку не курыць

Гродзенскія выратавальнікі актыўна прапрацоўваюць пытанне ўкаранення ў вытворчасць, а затым і выкарыстання цяжкаўзгаральных пасцельных рэчаў.

І вось на магілёўскім прадпрыемстве выпушчана першая партыя такой бялізны — 60 камплектаў, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС. Днямі ў Гродне выратавальнікі сумесна з работнікамі сацыяльнай службы ўручылі гэтыя камплекты адзінокім людзям і інвалідам 1-й і 2-й непрацоўных груп, якія маюць цягу да курэння. Цяжкаўзгаральная тканіна вырабляецца з поліэфіру, уласцівасці якога не дазваляюць цыгарэце, якая тлее, справакаваць пажар. У камплект уваходзяць чахлы на матрац, коўдру і падушкі, якія будуць выкарыстоўвацца пры наяўнасці зверху звычайнай пасцельнай бялізны. Практычныя выпрабаванні паказалі, што гэтае «ноу-хау» забяспечвае даволі высокую ступень абароны ад пажару. Хаця, зразумела, гарантыя бяспекі можа быць толькі адна: не курыць у ложку.

У Гродзенскім абласным упраўленні МНС разлічваюць, што цяжкаўзгаральныя пасцельныя рэчы будуць карыснымі ў дамах інвалідаў і састарэлых, гасцініцах, санаторыях і іншых установах.

ДА ВЕДАМА:

Толькі за першы квартал сёлетняга года ў Гродзенскай вобласці загінулі ў пажарах 22 чалавекі пенсійнага ўзросту, у тым ліку 10 — па прычыне курэння ў ложку.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Інавацыі і праекты

ШТО ПАСЕЕМ...

Ці з'явяцца ў нас суперустойлівыя сарты збожжа?

Новым сартам насення — быць! 16 чэрвеня была прынята новая дзяржаўная праграма па развіцці селекцыі і насенневодства збожжавых, збожжабабовых, тэхнічных і харчовых сельскагаспадарчых раслін на 2014—2020 гады. Яна стане працягам папярэдняй праграмы і, па сутнасці, завершыць няскончаныя праекты. Асаблівая ўвага будзе нададзена забеспячэнню айчынных вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі беларускім насеннем высокапрадукцыйных сартоў.

Калі гаварыць пра дасягненні, то ў Дзяржаўным рэестры Рэспублікі Беларусь за 2014 год зарэгістравана 365 сартоў селекцыі навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве, што складае прыкладна адну трэць ад агульнай колькасці сартоў у рэестры. Дарэчы, па словах **генеральнага дырэктара рэспубліканскага аб'яднання «Белнасенне» Пятра НІКАЛАЕНКІ,** сёння на беларускіх гаспадарках выкарыстоўваецца да 70% насення ўласнай вытворчасці, і гэта дазваляе значна эканоміць сродкі на закупку насення за мяжой.

Нарэшце вырашана праблема з забеспячэннем сыравінай для мукамольнай прамысловасці: цяпер з-за мяжы завозіцца высакаякасная пшаніца, якая выкарыстоўваецца толькі для паляпшэння якасці беларускіх сартоў гэтай культуры. Насенне ячменю для піваварнай прамысловасці вырабляецца ў дастатковай колькасці. Пётр Нікалаенка запэўніў, што няма ранейшых праблем з насеннем грэчкі.

Вялікую ролю ў развіцці селекцыі і насенневодства адыгрывае спецыяльнае абсталяванне. Так, у рамках папярэдняй праграмы было пабудавана 40 сучасных насеннеачышчальных комплексаў і 2 кукурузакалібровачных заводы. Ужо запланавана будаўніцтва фітатронна-біятэхналагічнага комплексу ў Жодзіне.

Аднак, нягледзячы на дасягнутыя поспехі, у галінах селекцыі і насенневодства застаецца шэраг праблем. У перспектыве селекцыянеры будуць працаваць над такімі пытаннямі, як павышэнне ўстойлівасці насення да маразоў, засухі і палягання. Хаця, паводле звестак **галоўнага навукоўца супрацоўніка Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Станіслава ГРЫБА,** беларускія сарты насення збожжавых культур больш устойлівыя да маразоў, чым еўрапейскія. Тым не менш праблема ўстойлівасці гатункаў насення да маразоў і палягання застаецца актуальнай у сувязі з кліматычнымі зрухамі: такія капрызы прыроды, як бураны ці нестандартныя тэмпературы дыктуюць свае правілы і для селекцыянераў.

Ізноў абвастраецца пытанне ўстойлівасці новых сартоў культур да раслінных хвароб. На думку Станіслава Грыба, варта ўдасканальваць метады селекцыі, а значыць, прымяняць генетычную і клетачную інжынерыю. «Разам з Інстытутам біялогіі НАН Беларусі маем магчымасць з дапамогай ДНК-маркераў вызначаць канкрэтныя гены ўстойлівасці да хвароб, якасці прадукцыі, што аблягчае правядзенне селекцыйнага працэсу», — заўважыў спецыяліст.

Кацярына РАДЗЮК

■ АЎТОграф

ГАЗУЙ!

МАЗ прэзентаваў новыя мадэлі аўтатэхнікі, якія працуюць на сціснутым газе

Газавікі ўвесь час казалі, што няма транспарту, каб будаваць запраўкі, а транспартнікі, што няма заправак для таго, каб выкарыстоўваць машыны на газе. Аднак справа патроху зрушылася з месца. «Газпрам» узяў на сябе абавязацельствы па будаўніцтве сеткі газавых заправак. У той жа час урады Расіі і Беларусі ўзялі на сябе абавязацельствы па пашырэнні колькасці тэхнікі, якая працуе на сціснутым прыродным газе. І вытворцы аўтамабіляў таксама не адстаюць. Спяшаецца заняць новую перспектыўную нішу Мінскі аўтамабільны завод. Напярэдадні 70-годдзя прадпрыемства прэзентавала некалькі новых мадэляў тэхнікі, сярод якіх газавы грузавік і аўтобус.

Новы бартавы грузавік МАЗ-534023, які працуе на сціснутым газе.

ЧАКАЕМ СЕРТЫФІКАЦЫІ

Як паведаміў **Павел ШАБАНАЎ, галоўны канструктар па аўтамабільнай тэхніцы ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючай кампаніі холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ»**, новы грузавік яшчэ не выпрабаваны, не мае сертыфікацыі. «А ў газавага аўтамабіля выпрабаванняў нашмат больш, чым у звычайнага. На гэта нам спатрэбіцца яшчэ два-тры месяцы. Аднак ніякіх праблем з гэтым не павінна быць. Тут усталяваны сучасны рухавік узроўню экалогіі Еўра-5, нарвежскае газавае абсталяванне з кампазітнымі балонамі», — заявіў спецыяліст. Між іншым, у першую чаргу гэтая мадэль разлічана на Беларусь і Расію. Аднак ёсць надзея і на іншыя рынкі. «Напрыклад, Польшча вельмі зацікаўлена ў газіфікаваным транспарце — у першую чаргу аўтобусах. Пасля мы, напэўна, будзем праектаваць грузавік з рухавіком экалагічнага ўзроўню Еўра-6», — сказаў Павел Шабанаў.

Дзве мадыфікацыі прыгараднага і міжгародняга аўтобуса МАЗ-232062 і МАЗ-232162, а таксама аўтобус МАЗ-203965, які працуе на сціснутым газе (справа).

Калі казаць увогуле пра экспарт нашых аўтамабіляў, то, па словах **Віталя ГАНЧАРЫКА, намесніка генеральнага дырэктара па знешнеэканамічных сувязях ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючай кампаніі холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ»**, сёння завод прадстаўлены больш чым у 50 краінах Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, СНД. «У нас шмат сваіх зборачных вытворчасцяў у іншых краінах. Дарэчы, для кожнага рынку мы ствараем канкрэтны аўтамабіль», — адзначыў спецыяліст.

ДЛЯ ПОЎНАЙ ЗАГРУЗКІ

Кіраўніцтва прадпрыемства спадзяецца, што новая тэхніка МАЗ, якая працуе на газе, паспрыяе пераадоленню страху людзей перад такім відам паліва. Для гарантыі бяспекі на заводзе прымянялі самыя апошнія тэхнічныя рашэнні, якія існуюць у гэтай галіне. Таму і грузавік, і пасажырскі аўтобус, як запэўніваюць канструктары, будуць цалкам бяспечнымі для людзей.

Аднак прэзентавалі на прадпрыемстве і звычайныя аўтобусы. Гэта дзве варыяцыі міжгародняга аўтобуса зменшанага памеру. Новыя машыны спатрэбіліся для таго, каб загружаць цалкам міжгароднія і прыгарадныя маршруты. Кіроўцы часта скардзіліся на тое, што аўтобус на 50 месцаў яны не загружаюць. Таму наспела патрэба зрабіць аўтобус на 30-35 месцаў. Атрымалася машына меншай даўжыні, з меншым рухавіком і, адпаведна, з меншым выдаткаваннем паліва. У такім класе аўтобусаў на рынку нават назіраецца пэўны вакуум, таму гэты сегмент будзе перспектыўным. Тым больш, што рухавікі адпавядаюць экалагічнаму класу Еўра-5.

ПЕРАМОВЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Выканаўца абавязкаў камерцыйнага дырэктара ААТ «МАЗ» Сяргей ЗАХАРЭВІЧ паведаміў, што перамовы па аб'яднанні МАЗа і КамАЗа працягваюцца. «На міжурадавым узроўні створана спецыяльная група, чарговае пасяджэнне якой запланавана на сярэдзіну жніўня. Калі чакаць аб'яднання? Сёння на гэтае пытанне няма адказу. Але група працуе прадуктыўна», — запэўніў ён. Перамовы аб аб'яднанні МАЗа і КамАЗа працягваюцца больш за тры гады. Раней агучвалася, што праект прадугледжвае стварэнне холдынгавай структуры шляхам перадачы ёй адпаведных пакетаў акцый абедзвюх кампаній: 75% плюс 1 акцыю перадасць МАЗ і 49,9% — КамАЗ. Паводле разлікаў, холдынгавая кампанія стане найбуйнейшай вытворчасцю аўтамабіляў на прасторы СНД.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.
Фота аўтара

■ Будаўніцтва

«КАВАЛАЧАК» ПІЦЕРА З'ЯВІЦЦА Ў МІНСКУ

А ў Калінінградзе беларусы, магчыма, будуць будаваць стадыён для чэмпіянату свету па футболе

Ці можна атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва кватэры ў горадзе-спадарожніку? Чаму здымаюць з чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў тых, хто атрымаў арэнднае жыллё? Навошта ліквідавалі аўтавакзал «Маскоўскі»? На гэтыя і іншыя пытанні адказваў <u>першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр КРУЧАНАЎ</u> падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

ДВА КВАРТАЛЫ

Існуе праект, які прадугледжвае будаўніцтва Санкт-Пецярбургскага квартала ў Мінску і Беларускага квартала ў Санкт-Пецярбургу. Пры будаўніцтве абодвух будуць задзейнічаны беларускія спецыялісты. «Прапанову ўзвесці такія кварталы агучыў губернатар Санкт-Пецярбурга, ён зацікаўлены і гатовы аказваць падтрымку. Мінбудархітэктуры таксама зацікаўлена ў прасоўванні гэтага праекта, — гаворыць намеснік міністра. — Праекціроўшчыкі РУП «Інстытут Белдзяржпраект» ужо распрацавалі прапановы па Беларускім квартале. Пры рэалізацыі праекта ў Санкт-Пецярбургу абавязкова павінна быць кампанія, якая выступіць у якасці інвестара — гэта прадугледжана расійскім заканадаўствам. Інвестарам для рэалізацыі нашага праекта будзе расійская група кампаній «Эталон».

Раней меркавалася пачаць будаўніцтва ў Мінску, а затым па меры гатоўнасці прыступіць да квартала ў Санкт-Пецярбургу, паколькі наша заканадаўства дазваляе хутчэй перайсці да дзеяння. «Але зараз мы плануем, што работы ў двух гарадах павінны весціся адначасова. Пры гэтым кварталы не будуць аднолькавымі — кожны з іх будзе мець нацыянальную спецыфіку. Так, у квартале, які пабудуюць у Санкт-Пецярбургу, з'явяцца крамы, дзе абавязкова будуць прадавацца прадукты беларускай вытворчасці. Мяркуецца, што там таксама з'явяцца жылыя дамы і дзіцячыя садкі. Прычым ёсць зацікаўленасць расійскага боку ў тым, каб гэта было жыллё не эканом-, а камфорт-класа. Для будаўніцтва квартала ў Мінску расійскаму боку было прапанавана некалькі варыянтаў размяшчэння, і ў выніку быў выбраны ўчастак у раёне вуліцы Філімонава. У Санкт-Пецярбургу для забудовы нам прапануюць каля 10 га. Мы былі гатовыя пачаць будаўніцтва ўжо сёлета, але ўчастак у Санкт-Пецярбургу пакуль знаходзіцца ў федэральнай уласнасці, перавод яго ў муніцыпальную ўласнасць зойме некаторы час».

ЭКСПАРТ

«Сёння трэба думаць на год-два наперад, каб задзейнічаць будаўнікоў, патэнцыял, які створаны ў будаўнічай галіне (стратэгічныя прадпрыемствы). Трэба яго захаваць і загрузіць. І адзін з кірункаў — экспарт. У гэтым напрамку сёлета мы актывізавалі працу. Прапрацаваны пытанні з Калінінградскай вобласцю. У прыватнасці, па будаўніцтве завода па зборцы аўтамабіляў «БМВ», «Опель». У рэгіёне добра зарэкамендавалі сябе 8-ы і 3-і будтрэсты. Зараз міністэрства гатова прапанаваць Калінінграду пабудаваць стадыён да правядзення чэмпіянату свету па футболе 2018 года. Таксама Беларусь зацікаўлена ў пастаўках жалезабетонных канструкцый і будаўніцтве жылля. Усе нашы домабудаўнічыя заводы мадэрнізаваны, трэба задзейнічаць іх магутнасці. У тым ліку за кошт экспарту», — лічыць Аляксандр Кручанаў.

«УСХОДНІ» ПАКУЛЬ ЗАСТАЕЦЦА

Адна жанчына пацікавілася лёсам мінскага аўтавакзала «Усходні» ў сувязі з дэмантажом будынка аўтавакзала «Маскоўскі» для будаўніцтва там комплексу ААТ «Газпрам». Аляксандр Кручанаў адказаў, што «Усходні» мае ўдалае месцазнаходжанне і сёння ён досыць запатрабаваны. «Рашэння аб тым, ці будзе будынак зносіцца або рэканструявацца, сёння няма. У будучыні яно можа быць прынята, але займацца гэтым будзе Мінгарвыканкам, — заявіў намеснік міністра. — Сродкі на дэмантаж будынка аўтавакзала «Маскоўскі» ў свой час выдзеліў замежны інвестар. Будаўніцтва ў краіне новага аб'екта з прыцягненнем замежных інвестыцый заўсёды з'яўляецца добрым паказчыкам. Бо што б ні здарылася, будынак застанецца на тэрыторыі рэспублікі, беларускія грамадзяне змогуць атрымаць у ім працоўныя месцы і зарабляць, а суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці будуць плаціць падаткі. Хіба ўсё гэта не з'яўляецца дабром?»

ЧАРГІ НЕ ЗАЙМАЦЬ...

Зараз у Беларусі актыўна будуецца арэнднае жыллё. Але тыя, хто атрымлівае яго, аўтаматычна выключаюцца з чаргі маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ці справядліва? Аляксандр Кручанаў лічыць, што безумоўна: «Дзяржава ў нас не вельмі багатая, і забяспечыць кожнага чаргавіка ўласным жыллём не ўяўляецца магчымым. Пры гэтым заўважу, што ва ўсім свеце доля арэнднага жылля пераважае над доляй прыватнага. Звярніце ўвагу на тое, што на чаргу сёння ставяць толькі па паказчыку недахопу плошчы, але ніяк не ўлічваюцца бягучыя даходы грамадзян. Таму на чарзе стаяць часта нават тыя, хто мае магчымасць з крэдытам, хай нават і камерцыйным, палепшыць жыллёвыя ўмовы. Аднак разважаюць грамадзяне так: навошта напружвацца, калі праз некалькі гадоў пабудуем танна, без розных абцяжаранняў і з 5-працэнтным прыбыткам забудоўшчыка. Менавіта таму прапанавана альтэрнатыва: альбо жыві ў арэндным жыллі і здымайся з чаргі тых, хто мае патрэбу, альбо чакай сваёй чаргі на будаўніцтва недарагога жылля. Як паказвае аналіз, тых, хто хоча жыць у арэндным жыллі цяпер, а не чакаць будаўніцтва сваёй кватэры, дастаткова шмат». Дарэчы, пытанне наконт выкупу арэнднага жылля не разглядаецца. «Яно будуецца за дзяржаўныя грошы і будзе прадастаўляцца толькі па дагаворы найму», — удакладніў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва.

Між іншым, за першае паўгоддзе ў Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю 96,9 тысячы кв.м агульнай плошчы жылых дамоў арэнднага тыпу (30,3% да задання на год) на 1754 кватэры, у тым ліку ў Мінску амаль 20,3 тысячы кв .м (19,8% да задання) на 388 кватэр, у Мінскай вобласці — больш за 4,1 тысячы кв.м (11,1%) на 80 кватэр, у Брэсцкай — 12,3 тысячы кв.м (30,6%) на 232 кватэры, у Віцебскай — 6,4 тысячы кв.м (26%) на 120 кватэр, у Гомельскай — каля 21,2 тысяч кв.м (60,8%) на 401 кватэру, у Гродзенскай — 22,6 тысячы кв.м (41,2%) на 372 кватэры, у Магілёўскай вобласці — 10 тысяч кв.м (39,2%) на 161 кватэру.

СПАДАРОЖНІКІ

У Беларусі плануецца актыўна развіваць гарады-спадарожнікі. Аднак калі чалавек, які мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пагодзіцца на будаўніцтва жылля менавіта ў такім горадзе, а не ў сталіцы, ці можа ён разлічваць на атрыманне льготнага крэдыту? «Ільготныя крэдыты пры будаўніцтве жылля ў гарадах-спадарожніках будуць давацца ў абавязковым парадку грамадзянам, якія маюць у адпаведнасці з заканадаўствам права на такі крэдыт, — адказаў Аляксандр Кручанаў. — Указам №13 прадугледжана, што тым, хто мяркуе будаваць жыллё ў гарадах-спадарожніках, крэдыты прадастаўляюцца тэрмінам на 20 гадоў. Працэнты за карыстанне гэтымі крэдытамі складуць 10% стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка, якая дзейнічае на дату зацвярджэння спісаў, але не менш за 3% гадавых. Напрыклад, сёння гэта 3%».

Нагадаем, што гарады-спадарожнікі Мінска — гэта Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск, Рудзенск, Смалявічы, Фаніпаль; горад-спадарожнік Брэста — Жабінка, спадарожнік Гродна — Скідзель.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

У 2015 годзе ў краіне будзе пабудавана 5 млн кв.м жылля

Пра гэта паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ.

«Гэта якраз той аб'ём, які сёння неабходны Беларусі. Ён дазваляе забяспечваць нарматыў па 1 кв.м на душу насельніцтва і быць па гэтым паказчыку лепшымі сярод краін СНД, а таксама дазваляе балансаваць з тымі магчымасцямі эканомікі, якія сёння ёсць у краіны. Таму мы плануем у 2015 годзе аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва пакінуць у межах 5 млн кв.м», — адзначыў міністр.

Пры гэтым кіраўнік ведамства падкрэсліў, што магутнасці будаўнічых арганізацый Беларусі па жыллёвым будаўніцтве значна большыя. «Пасля мадэрнізацыі толькі дамоў буйнапанэльнага домабудавання мы можам выпускаць 2,5 млн кв.м — а гэта палова праграмы. Магутнасцяў сапраўды напрацавана значна больш, таму будзем арыентавацца на экспарт», — растлумачыў ён.

Таксама Анатоль Чорны адзначыў, што 2015 год стане знакавым у плане новых падыходаў да крэдытавання і фінансавання будаўніцтва жылля. «Будуць функцыянаваць такія механізмы, як іпатэчнае крэдытаванне і будаўнічыя зберажэнні. Сёння Нацбанк актыўна гэтым пытаннем займаецца, рыхтуюцца дакументы, якія да канца года будуць прыняты. Гэта будзе новы імпульс для далейшага развіцця будаўніцтва жылля», — сказаў міністр.

Кар. «Звязды».

Лула КУНІ:

«...ЛІТАРАТУРУ НІХТО НЕ АДМЯНЯЎ»

Лула Куні — вядомая чачэнская паэтэса, перакладчыца. Жыве і працуе ў Грозным. Галоўны рэдактар мастацка-публіцыстычнага часопіса «Нана» («Маці»). Шмат сіл і намаганняў прыкладае для прапаганды беларускай літаратуры на Каўказе. Займаецца перакладамі беларускай паэзіі на чачэнскую мову. З Лулай Куні і сустрэўся наш карэспандэнт.

— Лула, ці ведаюць у Чачні беларускую літаратуру? Васіль Быкаў, Іван Шамякін, Алесь Адамовіч, Янка Купала, Якуб Колас... Ці знаёмы чачэнскаму чытачу гэтыя імёны?

— Ці ведаюць?.. Мяркую па сваім школьным і ўніверсітэцкім вопыце. Ведалі і любілі. Відаць, таму, што наша пакаленне — "прадукт" савецкай народнай адукацыі і, адпаведна, беларуская літаратура была нам блізкая. Што датычыць сённяшніх юных чытачоў і аматараў прыгожага пісьменства, то магу хіба што меркаваць пра тое, што ў нейкай ступені яны вельмі агульна знаёмыя з творчасцю беларускіх класікаў.

Шмат што змянілася ў сучаснай расійскай школе, у тым ліку — і стаўленне да літаратур брацкіх народаў (для мяне такое вызначэнне зусім не дэкларатыўнае) сышло на нішто: з разраду асноўных гадзін літаратура народаў СССР ці літаратура постсавецкіх дзяржаў перайшла ў разрад факультатыву.

Сёння — ва ўмовах вымушанага "развядзення мастоў" між народамі былога Саюза — шмат якія імёны літаратараў, чые творы маглі б лічыцца ў пэўнай ступені квінтэнсэнцыяй нацыянальнай ментальнасці, сталі для маладых чачэнскіх чытачоў проста імёнамі... На жаль...

— А наколькі актыўна сёння перакладаюць чачэнскіх аўтараў на рускую мову?

— Не так актыўна, як хацелася б. І як трэба было б. Чачэнскія пісьменнікі самі цяпер у актыўным пошуку перакладчыкаў на рускую мову. І гэта — нягледзячы на тое, што яны ёсць і дастаткова прадуктыўна працуюць. Аднак попыт перавышае магчымасці мясцовага цэха перакладчыкаў — працэнт іх не вельмі вялікі, каб вырашыць праблему масавага перакладу твораў чачэнскіх аўтараў. У свой час многія чачэнскія пісьменнікі, чые творы ўвайшлі ў класічны фонд нацыянальнай літаратуры, выходзілі і на шырокага расійскага чытача дзякуючы перакладчыкам з "цэнтра" і калегам-літаратарам са складу мясцовага Саюза пісьменнікаў.

У мінулыя гады рэспубліка адпраўляла ў Маскоўскі літінстытут імя М. Горкага — па дамоўленасці з кіраўніцтвам гэтай ВНУ — групы маладых людзей для навучання на факультэт перакладу. На жаль, мала хто з іх стаў пасля прафесійным перакладчыкам. І прычына, хутчэй, не ў адсутнасці ў іх жадання працаваць у абраным кірунку — напэўна, у тым, што іх праца ў пэўны момант стала раўназначнай падзвіжніцтву (калі гаварыць пра ўзровень аплаты і захаванні іх правоў як перакладчыкаў).

У нас яшчэ не выпрацаваны (і не ўлічваюцца ўжо існуючыя) разгорнутыя нарматыўныя акты, якія маглі б рэгуляваць дагаворныя абавязацельствы паміж аўтарам і перакладчыкам. Так, некаторы час тандэм "аўтар — перакладчык" можа існаваць, пакуль перакладчык супрацоўнічае з літаратарам на ўзроўні сяброўскай паслугі ці па прынцыпе "дамовімся па-свойску". Але калі мы мяркуем сапраўдную працу ў гэтым кірунку, то павінны паклапаціцца аб правах перакладчыкаў. Гэта ў сучасных рынкавых умовах вельмі важна.

— Мастацкі пераклад... Ці можа ён увогуле зблізіць, паяднаць народы, паўплываць на добрыя адносіны паміж носьбітамі розных рэлігійных перакананняў?

— Думаю, адказ на гэтае пытанне можа быць толькі станоўчым з афектным клічнікам. Літаратура мае дзіўную здольнасць раскрываць чалавечыя сэрцы. "Уключаць" адначасна і мозг, і душу...

Розныя рэлігійныя перакананні?.. Не такія яны ўжо і розныя...

Эпоха «Політэхнічнага» прайшла. Але і прайшлі часы манаполіі дзяржавы на «генеральную лінію» ў галовах яе грамадзян. Чытач мае права на выбар.

Мы — у масе сваёй — людзі Пісання. І этычныя максімы ў нас — ідэнтычныя. Прыхільнасць Адзінаму Тварцу ўжо само па сабе ёсць прызнанне маральнага імператыва. Яно дае народам вектар духоўнага развіцця, самаўдасканальвання, спрыяе іх яднанню. Мы — літаральна — народы Слова. Менавіта таму літаратура для нас — сутнасць адлюстравання нашага нацыянальнага "эга".

— А каго з чачэнскіх класікаў вы б параілі перакласці на беларускую мову? Стаў бы дзякуючы іх творам больш зразумелы чачэнец беларусам?

— Калі гаварыць пра класікаў літаратуры нахчы, можна з роўнай доляй упэўненасці агучыць шэраг імёнаў. Але я назвала б толькі некалькі: Магамед Салех Гадаеў, Саід Бадуеў, Халід Ашаеў, Магамет Мамакаеў, Абдул-Хамід Хамідаў, Абузар Айдамірaў... Чаму? Напэўна, таму, што творчасць кожнага з іх "высвечвае" пэўную грань этнадушы народа нахчы...

Думаю, што са мною пагодзяцца тыя, хто ставіць сабе за мэту зразумець нашу сутнасць...

Менавіта па творах гэтых чачэнскіх класікаў будучыя кюўе ад літаратуразнаўства і інш. змогуць узнавіць без скажэнняў наш этнічны партрэт.

— Наколькі актыўна чачэнская літаратура засвойвае электронную прастору? Яшчэ не зусім састарэла ў вас друкаваная кніга?

— Што цікава, чачэнскія пісьменнікі хутчэй засвоілі інтэрнэт, чым іх калегі па каўказскім рэгіёне. Відаць, таму, што пераканаліся: рукапісы ўсё ж гараць... Сама я згубіла некалькі мяхоў рукапісаў з-за вайны. Было смешна да істэрыкі, калі бачыла ў разбураным мінамі двары невялікае вогнішча (нехта вырашыў перадых-нуць ад бамбёжкі ў напаўразбураным доме, пакуль яго гаспадары — а гэта былі мы — бегалі ў пошуках прыстанку па разбураным цэнтры горада). А ў вогнішчы — сярод пераўтвораных у попел іншых рукапісаў — абгарэлыя лісточкі маёй пафаснай юначай паэмы... Хаця не асабліва шкадую аб згубленым, страчаным. Думаю, што гэта пазбавіла маіх чытачоў ад неабходнасці знаёмства з мноствам незавершаных экзерсісаў.

Не, не думаю, што друкаваная кніга ўвогуле можа састарэць. Кажу гэта як чалавек, які другі дзясятак гадоў праводзіць, уткнуўшыся ў манітор. Калісьці гэты занятак надакучвае да чорцікаў у вачах. І тады манітор з велізарнай асалодай мяняеш на трапяткую, "жывую" ў тваіх руках добрую старую кнігу. Чалавецтва з цяжкасцю і доўга развіваецца з тым, што праверана часам.

— Літаратура сёння... Наколькі, на ваш погляд, моцныя яе магчымасці ўплываў на грамадства, соцыум?

— Мне падобная баязлівасць сучасных літаратараў пазбавіцца ўплываў на розум сучасніка падаецца крыху надуманай. Так, безумоўна, эпоха "Політэхнічнага" прайшла. Але і прайшлі часы манаполіі дзяржавы на "генеральную лінію" ў галовах яе грамадзян. Свет шматпалярны. І мы — і чытачы, і літаратары — далёка не тыя, што ўчора. Чытач мае права на выбар. І права на павагу да сябе з боку таго, хто піша, права на нейкую, калі хочаце, парытэтнасць.

Мы прызвычаіліся да пафаснасці сваёй ролі за гады Саўдэпіі. Але любы пафас — з цягам часу — становіцца падманам "у імя". "Інжынераў чалавечых душ" з нас не атрымалася — і дзякуй Богу... Як і не атрымалася "честных зерцал" — на вялікі жаль... І, напэўна, таму, што мы — прадукт свайго часу. Слабы чалавек. І нішто мірское яму не чужое...

Але мы павінны быць роўнавялікія не чытачу (ён часта, на жаль, драбнее, становіцца часткай натоўпу, які спявае на плошчы чарговую малітву чарговым прусакам) — мы павінны быць роўнавялікімі Часу. Часу, дадзенага нам Богам, — для ўчынкаў, для асэнсавання значнасці самога жыцця, часу ў нас і нас у часе. Менавіта тады мы будзем цікавыя чытачу. І грамадству ў цэлым.

А магчымасці Літаратуры (не падробак) сапраўды вялікія... Інакш наша нацыя, якая перажыла дзесяцігоддзі крывавай бойні, не перажывала б усплёскі крэатыўнай энергіі. Кожны дзень нашы рэдакцыі (асабліва ў першыя пасляваенныя гады) даймалі аўтары — рознага ўзросту, сацыяльнага становішча (хаця, калі па праўдзе, становішча ва ўсіх нас было аднолькавае — пасляваеннае жабрацтва), рознага ўзроўню адоранасці...

Людзям трэба было выказацца...

Літаратуру — як нейкі глыток паветра, як магутны сродак духоўнага ўзнаўлення, своеасаблівага катарсісу — ніхто не адмяняў...

Рэлігія, літаратура, мастацтва... Гэта ўсё надзвычай важныя рэчы для нацыі, якая аказалася перад праблемай духоўнага адраджэння, якая шукае шляхі выхаду з бясконцага тунэля пакут і падманаў.

Мяне некалі вельмі закранулі радкі з "Малітвы" Янкі Купалы:

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

Напэўна, кожны з нас, хто ўзяўся за пяро, адчувае адказнасць за кожнае напісанае слова. Бо — праз жыццё — кожнае наша слова будзе ўзважана і адмерана на Шалях.

І няхай яно так і будзе.

Гутарыў Сяргей ЗАЛАМАЙ.
Грозны — Мінск.

■ Па-людску

«ЖЫВІЦЕ ТУТ! З БОГАМ»

Як на сельскім падворку буслоў ратавалі

Буслы на старым дрэве каля хаты Ларысы і Вячаслава Лісаў з'явіліся некалькі гадоў таму. Гаспадары змайстравалі буслянку, і птушкі ўладкавалі гняздо наступнай вясной. З той пары кожны красавік белыя птахі, вярнуўшыся з выраю, выводзілі птушанят, клапатліва кармілі іх, ставілі на крыло. Так было і сёлета. Ларыса Пятроўна ў перапынках паміж шматлікімі гаспадарчымі клопатамі замілавана паглядала ўверх. У чэрвені яшчэ не відаць было, колькі малых у гняздзе. Відавочна, што не адно: птушкі-бацькі бясконца насілі корм...

Навальніца наляцела раптам. Дождж ішоў як сцяна, кругом выла і гуло. І ў парыве ветру гняздо зляцела з дрэва і грымнулася на зямлю. Гаспадарскі конь, што быў прывязаны непадалёку, са страху аж сагнуў тоўсты жалезны прут, за які быў прывязаны. Гаспадары дома таксама пачулі гук абвалу, у першы момант падумалі, што знесла нейкія дошкі, шыфер або цэлую страху з хлява. Потым убачылі гняздо на зямлі. Над ім кружылі з адчайным крыкам буслы. Побач пішчалі няшчасныя бусляняты. Ларыса разам з дачкой Вольгай, якая на той час гасцявала з малымі дзецьмі ў сваіх бацькоў, сталі ратаваць буслянят. Жывых засталося трое. Адно, відаць, забілася пры падзенні. Трох малых буслоў жанчыны пасадзілі ў скрынку з сенам, крыху абагрэлі. Але паўстала пытанне, чым карміць. Зерня і кашы яны не елі. Тады Воля пачала лавіць жабак. І птушаняты з задавальненнем паядалі звыклую для іх страву.

Калі з кармленнем можна было справіцца самастойна, то з аднаўленнем жылля справа аказалася больш складанай. Давялося звярнуцца да аднавяскоўца Івана Коршуна, які працуе ў адной з арганізацый Тэлекама і мае прыстасаванне для лажання па слупах. На аперацыю па выратаванні буслоў ён згадзіўся не адразу, але, калі ўбачыў малых бездапаможных птушанят, пайшоў па свае шыпы.

Ларыса ЛІС з унукам Арсенам.

Першы раз Іван узлез на дрэва і замацаваў аснову для гнязда — кола. Другі раз груз быў яшчэ больш аб'ёмны: Ларыса прыгатавала цэлую посцілку з галінак дрэў, саломы. Калі і гэта было адпраўлена наверх, людзі насцярожана назіралі, ці прымуць буслы ад іх гэты дар. Думалі, можа, не захочуць будаваць гняздо з таго матэрыялу, што ім прапанавалі. А птушкі нібы толькі гэтага і чакалі. Адразу сталі завіхацца, як добрыя гаспадары дома. І за некалькі гадзін галінкі, лісце, салома зноў сталі ўтульным птушыным домам. Тады вясковага манцёра папрасілі падняцца яшчэ раз — ужо з кашом, дзе сядзелі птушаняты. Ён бераўліва пасадзіў малых у гняздо са словамі: "Ну, з Богам! Жывіце тут", — расказвае Ларыса Ліс.

Праўда, праз некаторы час дваіх буслянят бацькі з гнязда выкінулі. Іх выратавальнікі бачылі, што ў птушанят былі пашкоджаны крыльцы пры падзенні. Але людзі думалі, што ў гняздзе яны паступовы папраўляцца. Толькі ў прыроды законы жорсткія: ідзе выбракоўка слабых і нямоглых на карысць здаровых. Так што ўвага дарослых птушак была ў далейшым скіравана на аднаго. Ён сёння ўжо вырас у прыгожага белага птаха, якога бацькі навучаюць лятаць. Часам ён самастойна пакідае гняздо і нязменна вяртаецца ў яго зноў.

— Ну хоць аднаго выратавалі, і тое добра, — успамінае нядаўнюю гісторыю гаспадыня дома. — Мы так рады былі, калі яны пасяліліся ў нас. Бусел жа — птушка Божая.

Ларыса і Вячаслаў Лісы пераехалі ў Навасёлкі гадоў з дзясятак таму. Раней жылі і працавалі ў Баранавічах. У вёсцы купілі дом, заняліся гаспадаркай. Вырашылі, што гарадская кватэра спатрэбіцца з часам дзецям. Так яно і адбылося. У іх гаспадарцы ёсць карова, конь, авечкі, куры. У дзеда з бабуляй часта гасцююць гарадскія ўнукі. Трохгадовы Арсен з задавальненнем корміць малых куранят. Ён ведае, што на дрэве жывуць буслы, што чалавек павінен шанаваць і абараняць птушку ці малую жывёліну, а не крыўдзіць яе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Баранавіцкі раён.

Сямейная газета

Выпуск № 10 (14)

ТЫСЯЧА І АДНО

Я вельмі хацела напісаць пазітыўную калонку — гэткі «марш аптымістаў». Праўда. Усё ж лета, сонца, кветкі, ягады, канікулы і гэтак далей. Збірала гісторыі пра тое, як нават незнаёмыя людзі ў спёку робяцца бліжэйшымі адно да аднаго: вось малады хлопец заплаціў за квас пажылой жанчыны, у якой не хапала грошай, а вось чыйсьці дзядуля па ўласнай ініцыятыве дапамагае паліваць кветкі ў дзіцячым садку. Ці не нагода парадавацца за ўсіх нас?

Але на пазітыў зараду не хапіла. Звонку «смажанае» сонца плавіць асфальт і мазгі, і хочацца стронгай залегчы ў глыбокай рацэ. Знутры — зноў апякаюць навіны, якія па родзе дзейнасці чытаеш і бачыш штодня. Навіны, ад якіх сціскаецца сэрца. Са стужкі здарэнняў за адзін толькі дзень: у Мазыры вадзіцель збіў трохгадовага хлопчыка; 11-гадовая дзяўчынка патанула на вачах у маці ў Заходняй Дзвіне; у Смалявічах патануў падлетак. Дзеці тонуць, выпадаюць з вокнаў, трапляюць пад колы… Часта дарослыя зусім побач, але не паспяваюць зрэагаваць за лічаныя імгненні. Ці хутка скончыцца гэта чорная паласа? Хто б адказаў. А ДАІ нагадвае, што якраз на жнівень — верасень прыходзіцца пік ДТЗ з удзелам дзяцей і падлеткаў.

Немагчыма ўпільнаваць абсалютна ўсё. Я гэта ведаю на ўласным вопыце. Шмат гадоў таму падчас прагулкі ў дзіцячым садку (а групы былі не гумовыя, як цяпер, а да 20 чалавек, і ў кожнай два выхавацелі і нянечка), выхавальніцы нашы на хвіліну забавіліся з іншымі дзецьмі. І я, коўзаючыся на маленькай, у тры прыступкі, лесвіцы, разбіла аб гэтыя прыступкі патыліцу. Шок, крыкі, слёзы. Маму з работы выклікалі, нас на «хуткай» завезлі ў бальніцу, дзе мне наклалі шоў, а я, няўдзячная, абзывала хірурга «дзядзька-дурань»… Верагодна, што выхавальніцы забавіліся зусім не на хвілінку, а, скажам, на дзесяць. А можа, гэта я была зусім не такім ціхім і паслухмяным дзіцем, як сцвярджаюць тагачасныя характарыстыкі. Дакладна не памятаю. Як не ўспомню таксама, колькі часу заняло ў маіх бацькоў і іх сяброў (таксама сямейнай пары, толькі з двума сынамі) прымірэнне хлопцаў падчас агульнай вылазкі на Камсамольскае возера. Адвярнуліся ад нас з сястрой зусім ненадоўга. Азірнуліся — па вадзе толькі панамка маёй малодшай плыве. Умомант яе даталі — нават спалохацца не паспела. (Цяпер яна, да слова, сама трэнер па плаванні.) І сёння гэтыя гісторыі — з разраду сямейных паданняў, з якіх рагочам разам з бацькамі. А тады, тата аднойчы прызнаўся, ледзь не пасівеў…

Ужо сама стаўшы мамай, я даведалася, колькі часу трэба маленькаму чалавечку, каб прыставіць табурэтку і далезці да падаконніка. 8 секунд (смецце вынесці даўжэй). Калі ва ўзросце каля 1,5 года дачка ўпершыню здзейсніла гэты фокус — усё жыццё перад вачыма пранеслася. Не маё, яе. Зусім нядоўгае яшчэ і безабароннае. Так страшна мне ніколі не было. Мабыць, таму мы стараемся часцей паўтараць з ёй правілы бяспекі і расказваць пра святлафоры і машыны, запалкі і электрычнасць, вышыню і глыбіню…

Так, немагчыма ўпільнаваць усё. Але памятаць пра магчымую цану імгнення неабходна. Таму ўсе хорам — выратавальнікі МНС, міліцыянеры, урачы, журналісты — мы зноў і зноў нагадваем адно аднаму, дарослым: лепш дзесяць разоў пераправеryць, што і як. Сто разоў паказаць. Спатрэбіцца — і тысячу разоў паўтарыць. Каб не здарылася, крый Божа, таго адзінага, непапраўнага разу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

А ЯК ДУМАЕЦЕ ВЫ? ПАДЗЯЛІЦЦА: WWW.ZVIAZDA.BY

■ Няпростая тэма

ДРАМА НЕ РАЁННАГА МАШТАБУ

У АПОШНІЯ ДНІ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ЎСЮ МОЦ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ ПАДЗЕІ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА ВАКОЛ ДЗІЦЯЧАГА ДОМА СЯМЕЙНАГА ТЫПУ ІРЫНЫ І ВІКТАРА МОЦНЫХ З КЛІМАВІЧАЎ

Для маленькага гарадка скандал набыў небывалыя памеры. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца ў гэтай заблытанай справе на месцы і даведацца, які лёс чакае дзяцей, з першых вуснаў.
Ні ў якай меры газета не прэтэндуе на ролю трацейскага суддзі. Тым больш што пакуль няма падрабязных каментарыяў з боку афіцыйных асоб. Як паведамілі ў Клімавіцкім райвыканкаме, гэта робіцца ў мэтах захавання тайны следства і каб паменшыць псіхалагічныя траўмы. Таму і дзяцей прасілі не турбаваць. Запэўнілі: зараз яны ў камфортным месцы і з імі працуюць псіхолагі. А між тым у Клімавічах, у мясцовым судзе, разглядаецца адміністрацыйная справа аб самаўпраўстве Ірыны Моцнай. Дарэчы, сведкай з боку жанчыны выступае адна з выхаванак ДДСТ (дзіцячага дома сямейнага тыпу) Крысціна Пугачова. Яна лічыць: мама не вінаватая.



Фота Ната ЗІГУЛІ.

Крысціна ПУГАЧОВА падтрымлівае прыёмную маці і цяпер.

Устаньце, суд ідзе

31 ліпеня. На гадзінніку 14.30. Каля сціплага будынка суда Клімавіцкага раёна, акрамя Ірыны Моцнай, яе прыёмнай дачкі Крысціны і прадстаўніка РАУС — нікога. Міліцыянер не выказвае жадання размаўляць. А вось суддзя Ірына Гурыновіч нічога супраць маёй прысутнасці на пасяджэнні не мае, але каментаваць нешта адмаўляецца. Каментарыі — толькі пасля вынясення рашэння.

— Разглядаецца справа аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным артыкулам 23.39 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, — аб'яўляе суддзя. — Неабходна ўстанавіць асобу правапарушальніка. Устаньце, калі ласка. Назавіце сябе.

— Моцная Ірына Уладзіміраўна.

— Калі нарадзіліся?

— 17 снежня 1966 года.

— Дзе?

— У вёсцы Сабалёўка Клімавіцкага раёна.

Калі Моцная называе адрас, па якім жыве ў Клімавічах, нават нумар дома — 13 — усё гэта гучыць неяк злавесна.

Суддзя тлумачыць права падсуднай і дадае, што яна можа мець абаронцу. Моцная пагаджаецца, але трэба звязацца з калегіяй адвакатаў, каб прадаставіць абаронцу, таму суд пераносіцца.

Дарэчы, і наступнае пасяджэнне суда не аказалася апошнім. Ірына Моцная адмовілася ад адваката, якога ёй прапанавалі. Так што справа працягваецца.

Злашчасны чэрвень

Да нядаўняга часу ў сям'і Моцных выхоўвалася 6 дзяцей ва ўзросце ад 9 да 16 гадоў. Гэта — акрамя двух дарослых сыноў Дзмітрыя і Віталя, удачаронай Наталлі і Крысціны, якая знаходзілася пад апекай сям'і да таго, як паступіла у сталічную ВНУ. Да нядаўняга часу сям'я (адзіны ў раёне дзіцячы дом сямейнага тыпу) лічылася ўзорнай. Прынамсі, так сведчаць газетныя публікацыі, якія бераўліва захоўвае Ірына Моцная. Нешчаслівая паласа пачалася з **6 чэрвеня,** калі Крысціна, знаходзячыся ў сталіцы, здзейсніла спробу суіцыду. Бацькі памчаліся ў Мінск, каб наведаць яе ў шпіталі, але ў палату пайшла толькі Ірына. Муж застаўся чакаць яе ў машыне. Калі яна вярнулася, мужа ўжо не было. Калі знайсці яго не змаглі, звярнуліся ў міліцыю. Хутка стала вядома: бацька вялікага сямейства павесіўся на дрэве — насупраць той самай бальніцы. Далей усё пачалося рушыцца з хуткасцю картачнага доміка.

— **8 ліпеня** ў Клімавіцкі РАУС паступіла заява ад бабулі непаўналетніх Аліны і Яны Прохаравых, якія выхоўваюцца ў сям'і Моцных, па факце фізічнага пакарання дзяцей, — расказвае **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Клімавіцкага райвыканкама Наталля ГЛУШАКОВА.** — А **9 ліпеня** камісія (туды ўвайшлі інспектар ІСН, метадыст па ахове правоў дзяцінства, псіхолаг з аддзела адукацыі, класныя кіраўнікі дзяцей) наведала дом з мэтай апытаць выхаванцаў і абследаваць умовы пражывання. І тое, што на момант праверкі адсутнічала адна з дзяўчынак, 9-гадовая Яна Прохарава, занепакоіла. Ірына Уладзіміраўна адмаўлялася дакладна сказаць, дзе дзяўчынка, абяцала прывезці яе на наступны дзень, але я ўсё роўна напісала заяву ў міліцыю. Дзяўчынку прывезлі толькі праз дзень — **11 ліпеня**, калі справай пачала займацца міліцыя. Праваахоўнікі пацвердзілі, што мелі месца факты неналежнага выканання службовых абавязкаў, фізічнага пакарання, пакідання дзяцей на старонніх асоб без дазволу органаў апекі. І на пазапланавым пасяджэнні райвыканкама **12 ліпеня** было прынята рашэнне аб спыненні дзеяння дзіцячага дома сямейнага тыпу і вызваленні Ірыны Моцнай ад пасады апекуна. Жанчына была звольнена па артыкуле 47 ч. 3 Працоўнага кодэкса РБ «Здзяйсненне амаральнага ўчынку, несумяшчальнага з дадзенай працай, які выявіўся ў фізічным уздзеянні на непаўналетніх дзяцей». Мы яе апавяшчалі, але яна нідзе не ставіла свае подпісы. І працоўную кніжку нават не ўзяла. Але тыя грошы, якія мы ёй пералічылі на картку, не вярнула.

Намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА, якая таксама прысутнічала пры размове, пацвярджае, што да жанчыны і раней былі пытанні. Але апошнія парушэнні былі вельмі сур'ёзнымі.

14 ліпеня камісія паехала, каб забраць дзяцей, але ў іх не атрымалася, — працягвае размову Наталля Глушакова. — Яны ўпарта не ішлі на кантакт. І пры гэтым разважалі, як дарослыя: маўляў, вы нам нічым не дапамагалі, нас утрымлівае толькі мама, навошта вы нас забіраеце? Было відаць, што з дзецьмі добра папрацавалі. Яны казалі тое, што ў іх узросце яшчэ не кажуць і не разумеюць. Мы спрабавалі дамовіцца з Ірынай Уладзіміраўнай, казалі, што дзеці не павінны быць заложнікамі і жывым шчытом гэтых разбораў. Прапанавалі адправіць іх у лагер і вырашыць праблему. Але яна і слухаць нас не пажадала. Тады мы пайшлі ні з чым. А **25 ліпеня** яна спрабавала вывезці іх за межы Клімавіцкага раёна, але міліцыя іх затрымала. У той жа дзень мы завезлі дзяцей у лагер «Арляня». Спачатку яны плакалі, пыталіся, куды іх вязуць. Але, калі ўбачылі, што ў лагер, супакоіліся і, як толькі прыехалі, пабеглі скакаць на батутах. Потым я забрала Сашу з міліцыі, дзе ён аказаўся пасля затрымання разам з Ірынай Моцнай і яе старэйшым сынам. Ён збіраўся паступаць у Мінскі вышэйшы радыётэхнічны каледж і хваляваўся, што цяпер нічога не атрымаецца. Але, калі мы растлумачылі, што ён будзе там вучыцца, хлопец павесялеў і папрасіў, каб яго адвялі да астатніх дзяцей. Усе яны цяпер у SOS-вёсцы ў Магілёве і ніхто з іх не плача.

Як доказ Наталля Яўгенаўна дэманструе фота, на якім дзеці сядзяць у абдымку з ёю і Кацярынай Музычэнка.

— Чаму ж раней, калі быў жывы бацька-выхавацель, ніякіх пытанняў да сям'і не ўзнікала? — не разумею я. — Дзеці знаходзіліся на выхаванні з 2008 года і ўсё было добра?

— Па гэтым доме пытанняў было шмат. Мелі месца факты некарэктных метадаў выхавання. Аб гэтым сведчылі і педагогі школы, дзе вучыліся дзеці. Але сур'ёзных падстаў забраць дзяцей тады не было.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

«ЗВЯЗДА» + АНТ

■ У вас будзе дзіця

Багдан

Трэці год на тэлеканале АНТ існуе рубрыка «У вас будзе дзіця». Дзякуючы праграме, новыя сем'і знайшлі амаль 50 дзяцей. Да праекта далучылася і наша газета.

Гэтаму хлопчыку ўсяго 1,9 года. Жыве ён у пінскім Доме дзіцяці.

«Багданчык — добрае, ласкавае дзіця, — кажа выхавацель Наталля БОГДАН. — Любіць увагу і новыя кантакты, асабліва з дарослымі. Калі бачыць іх адабрэнне і ўсмешку, абавязкова падыдзе, папросіцца на ручкі. У нашай групе Багдан самы маленькі, але ён ужо ўмее прамаўляць некалькі слоў, самастойна есці і нават трохі апранацца. Хлопчыку патрэбна падтрымка і дапамога дарослага. Мы вельмі хацелі б, каб знайшоўся той чалавек, які падзеліцца з Багданам цеплынёй. Тады ён абавязкова вырасце моцным, прыгожым, удзячным хлопцам.

Каб больш даведацца пра Багдана, пазваніце па нумары (017) 284 71 51. Гэта нумар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі.

Святлана БАРЫСЕНКА

ДРАМА НЕ РАЁННАГА МАШТАБУ

Сям'я МОЦНЫХ задоўга да трагедыі. Тут яны выглядаюць шчаслівымі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Ірына Моцная насамрэч біла дзяцей?

— Па словах дзяцей, сапраўды мелі месца факты фізічнага пакарання. І Ірына Уладзіміраўна не адмаўлялася, што карала іх рэменем. Яны казалі нешта наконт сур'ёзнай правіннасці. Маўляў, і на калені на грэчку ставіла, і па карку магла даць.

— Пасля таго, як звольнілі маці, яна павінна будзе пакінуць гэты дом?

— Дом пабудаваны за кошт сродкаў з абласнога і рэспубліканскага бюджэту для сем'яў, якія ўзялі на выхаванне дзяцей-сірот і тых, што засталіся без апекі бацькоў. Гэта спецыяльнае памяшканне дзяржаўнага жыллёвага фонду. Дом знаходзіцца на балансе Клімавіцкага жылкама. Ірына Моцная павінна будзе яго пакінуць.

— Як вы думаеце, што яна збіралася зрабіць з дзецьмі?

— Не ведаю, але яе дзеянні не падпарадкоўваліся звычайнай логіцы. І гэта насцярожвала. Агрэсіўная, імпульсіўная, эмацыянальная, канфліктная — вельмі цяжкая ў зносінах.

— Дзеці за столькі гадоў прывязаліся да маці. Як яны зараз будуць жыць?

— Яны больш баяцца невядомасці. А калі ведаюць, што іх чакае, супакойваюцца. Жанчыне, калі яна хацела застацца з дзецьмі, трэба было адправіць іх у лагер і абскардзіць рашэнне райвыканкама ў аблвыканкаме ці судзе. Ёсць цывілізаваныя сродкі вырашэння канфліктаў.

«Звычайная помста»

Так лічыць звольненая маці. У свой час яе спецыяльна рэкамендавалі на гэтую пасаду: жанчына мае педагагічную адукацыю, шмат гадоў працавала настаўніцай, была намеснікам дырэктара школы і нават дырэктарам. Цяжка было знайсці лепшую кандыдатуру. У 2008 годзе вялікая сям'я Ірыны і Віктара Моцных уехала ў новы дом, у якім, па словах Ірыны Уладзіміраўны, аказалася шмат будаўнічых недаробак. Яна пачала дабівацца, каб адрамантавалі дах. Ёй не адмаўлялі, але, як потым высветлілася, рабілі гэта вельмі фармальна. Справа вырашылася пасля таго, як Моцная завітала на прыём да намесніка старшыні КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандра Агеева. Пасля гэтага былі пакараны некаторыя службовыя асобы. Будаўнічыя недаробкі хутка ліквідавалі. У дзяржаўнай газеце пасля гэтага выйшаў крытычны артыкул.

«Мы яе апавяшчалі, але яна нідзе не ставіла свае подпісы. І працоўную кніжку нават не ўзяла. Але тыя грошы, якія мы ёй пералічылі на картку, не вярнула».

— З гэтага моманту ўсё і пачалося, — лічыць Ірына Моцная. — Пра нас чыноўнікі забылі. Ніякай дапамогі: ні псіхалагічнай, ні сацыяльнай, ні матэрыяльнай. Ні адзін псіхолаг не прыйшоў. Толькі класныя кіраўнікі і настаўнікі прыходзілі, і тое раз у год. Ні аздараўлення дзецям, нічога. Іду прасіць, а мне мясцовы лагер прапаноўваюць. Потым зноў пачаліся праблемы з домам. У пазамінулым годзе кацёл сапсаваўся пасярод зімы. Я ў райана. Яны: «Дом не наш, мы не можам кацёл замяніць». У гаргазе таксама адмовілі: няма дагавора, не можам рамантаваць. Жылкам патлумачыў, што мы, як наймальнікі, павінны рабіць унутры ўсё самі. І ім усё роўна, дзеці тут жывуць ці звычайныя грамадзяне. Прыйшлося за свой кошт рабіць рамонт. Майстра вызывалі аж з Магілёва. Сёлета агароджа згніла, слупы завaліліся. Зноў прыйшлося ўсё рабіць за свой кошт. Сёлета ў маі пайшла на прыём да памочніка Прэзідэнта, папрасіла, каб зрабілі дзіцячую пляцоўку. На наступны дзень прывезлі слупкі, арэлі, але справы да канца не давялі. Усё гэта каштавала нерваў. Муж мой быў неканфліктны чалавек, гэта я хадзіла па чыноўніках. Пачалі з ім сварыцца. Не ведалі, як далей жыць. А 6 чэрвеня з Крысцінай адбылася бяда, дзяўчына пасварылася з хлопцам. Паехалі да яе. Далей вы ведаеце…

У дзень пахавання я папрасіла аддзел адукацыі, каб дзяцей забралі ў лагер і яны нічога не бачылі. Там да іх і наведалася бабуля Прохаравых, якая хацела забраць дзяўчынак пад сваю апеку. З Прохаравымі наогул не магла знайсці агульнай мовы. Яны быццам раўнавалі дзяўчынак да мяне. І пайшло адно да аднаго. Мяне звольнілі па артыкуле. Але дзе той дакумент, які пацвярджае факт майго амаральнага ўчынку? Мне яго не паказалі. Нічога няма, акрамя павесткі ў суд.

— Што вас цяпер чакае?

— Не ведаю. Я хацела б вярнуць дзетак, бо не заслужыла таго пакарання, якое мне прад'явілі. Звольнілі па артыкуле, а мне яшчэ працаваць далей. Я ж педагог. Грошы аддалі, адпускныя за 9 гадоў. Мне гэты водпуск быў непатрэбны. Што далей будзе, не ведаю. Бачыла, як Саша Пугачоў напісаў на сваёй старонцы ў інтэрнэце: «Хачу да мамы». У мяне цяпер вельмі цяжкі перыяд. Муж пайшоў з жыцця, дзяцей забралі… Хто я? Дом не мой, дзяцей, як моркву, вырвалі і перанеслі на іншую градку. Ці можна так?

— Каб нешта патлумачыць у гэтай гісторыі, у ёй перш за ўсё, трэба дэталёва разабрацца,— кажа ***намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.*** *— Дзеці насамрэч знаходзіліся ў крытычнай сітуацыі. І тое, што трэба было прымаць нейкія надзвычайныя меры, апраўдана. Дзецям трэба было хутка аказваць дапамогу. Органы апекі і папячыцельства паводзілі сябе ў гэтай гісторыі менавіта так, як і трэба было. Але спецыялісты яшчэ дадуць ацэнку таму, што адбылося. Ніякага ціску на дзяцей не аказваецца. Ім нават не забаронена тэлефанаваць іх былой выхавальніцы. Паўтараю, усё робіцца ў інтарэсах дзяцей.*

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Кампетэнтна

Ірына МІРОНАВА, дырэктар Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь:

— Я не ведаю дэталяў гэтай сітуацыі, таму не бяруся меркаваць, хто ў ёй мае рацыю, а хто вінаваты. Але хачу нагадаць пра самае галоўнае: у цэнтры ўвагі павінны быць дзеці, і ўсе рашэнні трэба прымаць, зыходзячы з іх інтарэсаў.

Канфлікт у Клімавічах — не адзінкавы выпадак, калі прадстаўнікі раённых улад, аддзелаў адукацыі прымаюць рашэнне спыніць кантракт з прыёмнымі бацькамі. Пра гэта шмат пісалі ў СМІ, быў вялікі рэзананс, эмацыянальныя абмеркаванні… І кожны раз у розных бакоў свая праўда: прыёмныя бацькі лічаць сябе пакрыўджанымі, прадстаўнікі органаў апекі ўпэўнены, што зрабілі правільныя крокі. Меркавання саміх дзяцей звычайна мы наогул не чуем. Як і не ўяўляем, які ўплыў гэтыя канфлікты і іх асвятленне аказваюць на іншыя сямейныя формы ўладкавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, адпужваючы многіх патэнцыйных прыёмных бацькоў… Як мне падаецца, **такія сітуацыі будуць здарацца і надалей — да той пары, пакуль не будуць выпрацаваны аб'ектыўныя крытэрыі ацэнкі становішча дзяцей у сям'і. Якімі яны павінны быць? Паўтаруся: у цэнтры ўвагі — дзіця і яго бяспека.** Ці здольны яе забяспечыць прыёмныя бацькі? Дарэчы, гэтыя крытэрыі павінны датычыцца і біялагічных сем'яў, бо правы ва ўсіх дзяцей роўныя! І іх павінны ведаць усе — і прыёмныя бацькі, і біялагічныя, і спецыялісты па ахове дзяцінства.

Другое пытанне: ці магчыма выпрацаваць такія крытэрыі? Сусветны вопыт паказвае, што так, цалкам магчыма. І не толькі выпрацаваць, але зрабіць іх адзінымі і замацаваць на заканадаўчым узроўні, каб у спрэчных сітуацыях ні ў каго не ўзнікала пытанняў і сумненняў, ці правільнае рашэнне прынята. Трэба выключыць эмоцыі, якія перашкаджаюць цвяроза, узважана ацаніць стан рэчаў, і выкарыстоўваць навуковы падыход: вывучыць сукупнасць фактараў, якія сведчаць пра становішча дзіцяці ў сям'і, прааналізаваць, якія з іх насамрэч уплываюць на бяспеку дзіцяці, а якія не робяць істотны ўплыў. У Міжнародным дзіцячым фондзе, дарэчы, была спроба правесці такі аналіз і выпрацаваць агульныя крытэрыі, з тым, каб ацаніць не толькі бягучы стан: як дзіця адчувае сябе тут і цяпер, але і зрабіць прагноз на перспектыву — ці будзе яму добра праз некалькі тыдняў, месяцаў? У прыёмнай сям'і з Клімавічаў відавочна змянілася сямейная дынаміка пасля таго, як пайшоў з жыцця адзін з бацькоў. Але як гэта паўплывала на дзяцей, як адбілася на здольнасці прыёмнай маці аказваць ім падтрымку? Калі б падобная ацэнка была праведзена, я ўпэўнена, што ўдалося б знайсці рашэнне, якое задаволіла б усе бакі. Цяпер жа ідзе паглыбленне, эскалацыя канфлікту. А дзіця — яно не крэсла, яго нельга проста так узяць і перасунуць з месца на месца. Напрыклад, у ЗША на дзяржаўным узроўні абмяжоўваецца колькасць перамяшчэнняў дзяцей паміж рознымі сем'ям, бо кожнае перамяшчэнне — гэта вялікі стрэс.

Таму я выступаю за тое, каб і ў нас усе зацікаўленыя бакі прыйшлі да паразумення. Тым больш, што ў 2015 годзе ў Беларусі плануецца ліквідаваць усе дзіцячыя дамы і інтэрнаты, пакінуўшы толькі сямейныя формы ўладкавання дзяцей-сірот.

УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, АБО ЯК Я НАВУЧЫЛАСЯ ХЛУСІЦЬ

— Усё будзе добра — я абяцаю, — прамаўляю ўпэўнена і сама дзіўлюся.

Я рэдка даю абяцанні, баюся іх, бо адчуваю вялікую адказнасць і павінна выканаць, чаго б мне гэта ні каштавала. Цяпер я адчуваю, што не здолею, што словы мае пустыя. Але так перакаўча вымаўляю іх, што сама пачынаю верыць.

Анжэла адна гадуе дваіх дзяцей. І ў абаіх адзін дыягназ. Сур'ёзны, цяжкі дыягназ. Яны змагаюцца ўтраіх. Дачка пераносіць лячэнне лепш, а вось сын ужо некалькі дзён у рэанімацыі. Яго стан толькі пагаршаецца. Анжэла пачынае думаць пра самае страшнае і прызнаецца мне, што не вытрывае.

— Усё. Будзе. Добра, — паўтараю я, каб замаскіраваць свой страх.

Калі я навучылася хлусіць? Навошта гэта раблю? І што стала з маёй адказнасцю?

Калі я сутыкнулася з першай стратай у дзіцячым анкагематалагічным цэнтры і толькі пачынала разумець, куды мяне занесла, я катастрафічна баялася размоў з бацькамі.

Калі не стала Вані, я сустрэла яго маці ў мінскім метро. «Толькі б не заўважыла, толькі б не пазнала», — маліла я і бегла адтуль.

Пра што нам размаўляць? Агульная тэма толькі адна. А яе трэба пазбягаць.

Аднойчы я тэлефанавала па незнаёмым нумары, які знайшла ў інтэрнэце. Дзяўчына лячылася ў Ізраілі, і ў сям'і заканчваліся грошы. Мы сабралі добрую суму і хацелі перавесці на яе рахунак. Я загадзя падрыхтавала прывітальнае слова, прадумала, як прадстаўлюся, ветліва спытаю пра Надзіны справы. Трубку зняў тата. Ён не адразу перарваў маё аптымістычнае шчабятанне. Даслухаў да канца і ўздыхнуў:

— Сёння Надзі не стала. Заўтра мы едзем у Ізраіль, каб забраць яе.

Я вінаваціла сябе за неасцярожнасць у размове, за бестурботнасць, за спазненне. І з таго часу стараюся быць гатовай, кожны раз быць гатовай да таго, што некага не стане. Не толькі са знаёмымі з анкацэнтра і падапечнымі. Я рыхтуюся да гэтага ў сваім жыцці, са сваімі блізкімі, сябрамі. Як толькі знаёмлюся з чалавекам, адразу даю сабе ўстаноўку, што аднойчы яго можа не стаць. Хаця, па шчырасці, быць гатовай да гэтага немагчыма.

Я ведаю гэта, калі размаўляю з іх бацькамі, ведаю, калі зазіраю ім у вочы і шчыра абяцаю:

— Усё будзе добра.

Дык хто ж навучыў мяне хлусіць?

Жэнька быў надзвычай жыццярадасным. Яго круглыя шчокі здаваліся яшчэ больш круглымі, бо рот заўсёды расцягвала шырокая ўсмешка. Яго жарты, розыгрышы, прыколы абажала ўсё аддзяленне. Калі яго забіралі дадому на выхадныя, нашы гульні і сустрэчы гублялі традыцыйны смак бесклапотнасці і пазітыву.

Калі Жэню перавялі ў хоспіс як безнадзейнага, ён умудраўся нават нас, валанцёраў, падтрымліваць. Расказваў, як клапоціцца пра здароўе, як настройвае свой мозг на перамогу, як засвойвае афірмацыі, лячэнне травамі, як «абавязкова паправіцца, куды ён падзенецца». Калі Жэнька перажываў самыя цяжкія часы, на яго старонцы ў сацыяльнай сетцы з'явіўся статус: «Усё добра». Ён так і застаўся там, калі Жэні не стала. І ведаеце, гэта сапраўды супакойвае, гэта насамрэч дае веру, што ў яго ўсё добра. Нават цяпер.

Другі Жэнька *(у нас чамусьці шмат падапечных з гэтым іменем)* разам з хваробай адкрыў для сябе свет добрых людзей. Дагэтуль ён не шмат бачыў і нават не ведаў, што бывае па-іншаму. Разам з цяжкім дыягназам у яго жыццё ўвайшлі клопат і любоў. Ён атрымліваў іх і аддаваў далей. Мы цешыліся ў промнях яго чароўнай усмешкі, заварожваліся позіркам і «кайфавалі» ад наймілейшай энергетыкі гэтага хлопца. Яго чары растварылі мае намаганні настроіцца на страту. Ён доўга і паспяхова лячыўся. Крок за крокам ішоў у новае жыццё. На яго вачах сыходзілі сябры. Ён кожны раз вельмі перажываў, але, здавалася, ніколі не прымяраў гэта на сябе. З ім такое не здарыцца.

Жэнькі не стала раптоўна. Ніхто не чакаў. Ніхто не быў гатовы. Мы наіўна верылі яго абяцанням.

…Мама Анжэла патэлефанавала напаўпрытомнай. Ціха, з доўгімі паўзамі яна расказала, што раніцай наведала сына ў аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі. Ён быў у коме. А калі прыйшла туды ў абедзенны час, медперсанал паведаміў страшную навіну.

— Яго сястры мы пакуль не сказалі. Яна ў сваякоў у іншым горадзе, сама нядаўна пасля аперацыі. Мы баімся, каб шок і боль не пагоршылі яе стан. Я страціла сына і не магу страціць яшчэ і дачку.

— Вы не страціце яе! — абарвала я. — Яна будзе жыць, і вам трэба

жыць дзеля яе! Усё будзе добра.

Сказала і жахнулася. Я чула збоку свой настойлівы голас і не верыла, што гэта я. Адкуль мне ведаць? І з чаго б ёй верыць? Верыць мне, якая пераконвала, што яе сын паправіцца. Ці не хопіць падману? Хто навучыў мяне хлусіць?

Яны навучылі, мае падапечныя. Хлопцы і дзяўчаты, якія змагаюцца са смяротнай хваробай з усмешкай на вуснах. Яны не заўсёды перамагаюць у бітве за жыццё. Але сыходзяць з такім непераможным выглядам, са статусам «Усё добра», што арбітр вымушаны засведчыць: «Нічыя!»

Я сапраўды не ведаю, што чакае дачку Анжэлы. Медыцынскія прагнозы часта падводзяць, ды і самі медыкі неахвотна іх робяць: усё ў руках Госпада. Нам застаецца толькі спадзявацца і верыць, нягледзячы ні на што: усё будзе добра.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА, кіраўнік дабрачыннага руху «Клуб 5000».

■ Тэрыторыя шчасця

МАЛЕНЬКІЯ «КРАІНЫ» З ВУЛІЦЫ СОНЕЧНАЙ

Неяк давялося пачуць прыгожае выказванне: «Калі краіна — вялікая сям'я, то сям'я — маленькая краіна!» Сапраўды, кожная сям'я — гэта асобная невялічкая дзяржава са сваімі традыцыямі і правіламі. На чым жа грунтуецца моц, трываласць і адзінства сям'і? Можна доўга разважаць на гэтую тэму, але лепш за ўсё, напэўна, пачуць адказ з першых вуснаў. Тым больш, мне і далёка ісці не трэба: у вёсцы Варацішчы Уздзенскага раёна на маленькай вулачцы з цудоўнай назвай Сонечная жывуць адразу тры шматдзетныя сям'і.

УСЯМУ НАВУЧЫШСЯ

Дзіяна і Аляксандр Барышнікавы выхоўваюць чатырох дзяцей.

— Калі мы ажаніліся, муж адразу сказаў, што хоча шмат малых, — расказвае Дзіяна. — Але я не надала вялікага значэння гэтым словам, не ўяўляла, што стану мнагадзетнай мамай.

Барышнікавы пераехалі на Уздзеншчыну адносна нядаўна. Жонка знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзяцей, а Аляксандр працуе дырэктарам саўгаса «Гарадок». Малады аграном і не думаў, што, пераехаўшы ў вёску, дарасце да такой пасады. Але зарэкамендаваў сябе старанным і руплівым працаўніком, што і дазволіла заняць крэсла кіраўніка.

Дзіяна родам з Літвы. Вучылася таксама на радзіме, дзе і сустрэлася з прывабным студэнтам Аляксандрам. Паміж маладымі людзьмі ўспыхнула іскра прыцягнення, якая перарасла ў полымя кахання, а потым і ў сямейны ачаг. Спачатку на свет з'явілася дачка Алеся. Бацькам яшчэ хацелася сыночка, і нарадзіўся Антон, праз нейкі час — сын Іонас, а ў першую ноч 2014 года — дачушка Гражына.

— Безумоўна, калі з'явілася на свет трэцяе дзіця, а затым і чацвёртае, мяне ахапіла роспач, — згадвае Дзіяна. — Няпроста было спраўляцца: паспець усіх накарміць, напаіць, пакласці спаць. На дапамогу прыйшлі родныя. А з цягам часу ўсяму навучыліся самі, дапамагаем адно аднаму.

Алеся, Іонас і Антон БАРЫШНІКАВЫ.

Калі з'явілася на свет трэцяе дзіця, а затым і чацвёртае, мяне ахапіла роспач. Няпроста было спраўляцца: паспець усіх накарміць, напаіць, пакласці спаць.

Барышнікавых цяжкасці не палохаюць. Што муж з жонкай не ведаюць, вывучаюць па кнігах, а паколькі па адукацыі аграномы, то і ад працы на зямлі не адмаўляюцца.

— Што і казаць, складана ставіць на ногі чатырох дзяцей, — разважае Дзіяна. — Але галоўнае, каб у сям'і былі разуменне і згода, каб дзеткі не хварэлі. Астатняе — справа нажыўная.

КАМЧАЦКАЯ ЗАГАРТОЎКА

У народзе кажуць: «Адзін сын — не сын, два сына — паўсына, тры сыны — сын!» З такім дэвізам па жыцці ідзе сям'я Уладзіміра і Алены Козічаў, якія выхоўваюць 5 дзяцей.

Сям'я пераехала ў Беларусь з Камчаткі. Алена там працавала поварам у сталоўцы і, мабыць, пакарыла сэрца беларуса Уладзіміра не толькі прывабнай знешнасцю… Праз год пасля вяселля маладая пара радавалася нараджэнню сына. Каб было весялей яму падрастаць, вырашылі нарадзіць дачушку. У 1995 годзе пераехалі ў Беларусь, бо Уладзіміра пацягнула на радзіму, і ўжо тут з'явіліся на свет яшчэ адна дачушка і два сыночкі. Старэйшы сын Андрэй закончыў сталічны каледж і зараз працуе на рамонтна-вагонным заводзе ў Мінску, дачка Дар'я вучыцца ў сталіцы на повара, Карына скончыла ў гэтым годзе школу, а маленькія Дзяніс і Ілья напаўняюць вялікі дом дзіцячым смехам.

Гаспадар пры сустрэчы выглядае заклапочаным і крыху стомленым. Зразумела, вялікая сям'я — гэта не толькі радасць, але і шмат штодзённых турбот, асабліва калі яны сумяшчаюцца з напружанай працай у саўгасе.

Алена з ветлівай усмешкай запрашае да стала:

— Вось толькі прысела за ўвесь дзень. Зусім мала часу на адпачынак. Муж з раніцы да вечара на рабоце, таму даводзіцца самой спраўляцца з усімі хатнімі клопатамі, а старэйшыя дзеці дапамагаюць па гаспадарцы.

НЕ БЫТАМ АДЗІНЫМ

Як толькі адчыняю наступную брамку, насустрач выбягае цікаўнае дзяўчо:

— Вы з газеты? І фатаграфаваць будзеце?

— Так, з газеты! А дарослыя дома?

Не паспела падысці да дзвярэй, як насустрач выйшла гаспадыня і ветліва запрасіла ў хату.

Сям'я ЗЯНЬКОВІЧАЎ.

Малодшыя дзеці КОЗІЧАЎ.

Наталля і Аляксандр Зяньковічы гадуюць чатырох цудоўных дачок. Наталля родам з Расіі. Там вырасла, скончыла 9 класаў. Так склаліся абставіны, што яе сям'я пераехала ў Беларусь. Тут і сустрэлі адно аднаго Аляксандр і Наталля.

— Пазнаёмілася з мужам у дзень нараджэння. Ён адзначаў сваё свята, а я з сяброўкамі — сваё. Аб'ядналіся кампаніямі…

З кожнай сустрэчай маладыя людзі сцвярджаліся ў думцы, што створаны адно для аднаго. Ім было цікава і прыемна разам бавіць час: размаўлялі на розныя тэмы, пазней сталі будаваць сумесныя планы… Цяпер Аляксандр Зяньковіч працуе ў дарожнай службе, Наталля пакуль што ў дэкрэтным водпуску. У іх падрастаюць дачушкі Вераніка, Настасся, Ангеліна і Ульянка.

— Я ніколі не думала, што стану шматдзетнай мамай, — кажа Наталля. — Але лічу, што калі ёсць магчымасці і дазваляе здароўе, то чаму б і не. Галоўнае, каб паміж мужам і жонкай былі ўзаемаразуменне, каханне, павага, каб дзеці не хварэлі, а ў сям'і панавала шчасце.

Як бадай у любой сям'і, у Зяньковічаў існуюць і бытавыя, і матэрыяльныя праблемы, і пытанні ўзаемаадносін. Але Наталля не скардзіцца, сцвярджае, што яна ўсім задаволена.

Крыху нязвыкла было назіраць, як суровы з выгляду, нешматслоўны Аляксандр бярэ на рукі самую маленькую дачушку. Але за знешняй стрыманасцю праглядвае бацькоўская пяшчота. Таму можна не сумнявацца, што ў час адсутнасці дома маці малышка і яе сёстры атрымліваюць не меншы клопат і ўвагу ад бацькі.

…Кажуць, для закаханых час прыпыняе свой бег. Яны і цяпер адчуваюць сябе маладымі, такімі ж шчаслівымі, акрыленымі, як у першыя месяцы сумеснага жыцця. Атмасфера ўзаемавыручкі, павагі, добразычлівасці пануе ў сям'і. Усе дамашнія справы выконваюць разам, праблемы таксама вырашаюць сумесна, пры гэтым абавязкова ўлічваючы інтарэсы кожнага. А гэта станоўча адбіваецца на ўзаемаадносінах паміж мужам і жонкай і на дзетках, якія кожнае імгненне адчуваюць клопат і ўвагу бацькоў.

Гледзячы на гэтыя сем'і, разумееш, што яны ўсе непаўторныя і ў той жа час падобныя, бо жывуць весела і дружна ў сваіх маленькіх краінах. А яшчэ, думаю, для кожнага з нас важна не толькі знайсці мужа (жонку), але і ўмець на працягу ўсяго сямейнага жыцця не расчаравацца адно ў адным. Сямейнае жыццё — своеасаблівая дыпламатыя: калі ўдасца асвоіць навуку адносін у сям'і, шчасце абавязкова будзе крочыць побач.

Дар'я ЗЯНЬКОВІЧ. Фота аўтара

■ Хутка ў школу

ЦІ ГАТОВА ДЗІЦЯ ДА НАГРУЗАК?

Шасцігодку, які пойдзе ў школу, чакае нязвыклая, цікавая і вельмі нялёгкая праца. І запатрабуе яна не толькі пэўных фізічных намаганняў, але і вялікага нервовага напружання.

Большасць першакласнікаў паспяхова авалодвае школьнай праграмай, але некаторыя сутыкаюцца з цяжкасцямі. Яны не ў стане выседзець урок і засяроджана займацца. Іх увага хутка рассейваецца, яны не здольны поўнасцю асэнсаваць усё тое, пра што распавядае настаўнік. У выніку паступова страчваецца цікавасць да школы.

Самымі няпростымі бываюць першыя дні (а для часткі дзяцей — першыя месяцы). Гэта перыяд адаптацыі да новых умоў. Для перыяду адаптацыі звычайна характэрныя: парушэнне сну, апетыту, раздражняльнасць, замкнёнасць, плаксівасць.

Некаторыя пачынаюць часцей хварэць, а гэта яшчэ больш аслабляе арганізм.

— Дзіця неабходна абавязкова рыхтаваць да школы, — кажа **ўрач-валеолаг Мінскага гарадскога псіхіятрычнага дыспансера Леанід МЯЛЕШКА.** — У ідэале бацькам варта аб'яднаць намаганні з урачом-педыятрам.

1. Дзеці здаровыя, фізічна трывалыя, з высокай супраціўляльнасцю (якія рэдка і не працягла хварэюць) лёгка пераносяць адаптацыю. І наадварот, аслаблены арганізм, частыя прастудныя захворванні, хранічныя паталогіі — фактары рызыкі ў гатоўнасці дзіцяці да паступлення ў школу.

2. Для своечасовага пісьма патрабуецца трэніроўка кісці. У многіх дзяцей 6 гадоў яшчэ не завершана развіццё мышачна-звязкавага апарату, устойлівы хапальны рэфлекс: ім лягчэй трымаць лыжку, аловак, аўтаручку ў кулаку. Неабходна вучыць малое правільна трымаць аловак трыма пальцамі, пасля шляхам практыкаванняў дабіцца дакладнасці, скаардынаванасці рухаў.

3. Вызначае гатоўнасць да школы і правільнасць вымаўлення. Дзіця павінна назваць карцінкі, падабраныя такім чынам, каб пэўны гук быў у пачатку, сярэдзіне і ў канцы. Напрыклад, гэта могуць быць малюнкі з выявамі рыбы, барабана, шара. Няправільнае вымаўленне хоць бы аднаго гука расцэньваецца як нявыкананы этап.

4. Да 6 гадоў дзіця трэба навучыць выконваць комплекс ранішняй гімнастыкі, катацца на двухколавым веласіпедзе і лыжах.

5. Трэба прывучыць дзіця і да рэжыму дня: у пэўны, адзін і той жа час прачынацца і класціся спаць, прымаць ежу, гуляць, выконваць школьныя заданні.

6. На 6-м годзе жыцця найбольш часта выяўляюцца дэфекты постаці. Адхіленні ў постаці прыводзяць не толькі да дэфектаў апорна-рухальнага апарату, але і неспрыяльна адбіваюцца на размяшчэнні і рабоце ўнутраных органаў (лёгкіх, сэрца, печані, страўнікава-кішачнага тракту). Неабходна фарміраваць правільную постаць падчас хады, сядзення і стаяння.

7. Неабходна сфарміраваць навыкі асабістай гігіены, а таксама веды і ўменні для самаабслугоўвання: як увайсці ў клас, як сядзець за партай, як скласці кнігі ў партфель, як акуратна апрануцца, як карыстацца прыбіральняй, як весці сябе ў школьнай сталовай, як паводзіць сябе з равеснікамі...

Святлана БАРЫСЕНКА

■ Без адваката не разбярэшся

КВАДРАТНЫЯ МЕТРЫ РАЗЛАДУ

«Праз год пасля смерці бацькі мы з мамай хацелі б прадаць бацькоўскую кватэру — прыватызаваную трохпакаёўку. Але брат з сям'ёй (жонка і дачка), якія жывуць у гэтай жа кватэры, супраць. Пры гэтым усе, уключаючы мяне, прапісаны ў кватэры, хоць я з сям'ёй жыву асобна. Ці можам мы прадаць кватэру (альбо свае долі ў ёй) або размяняць яе без згоды брата?»

Аксана Васілеўская, г. Мінск.

— Калі пры жыцці бацькі кватэра была прыватызавана бацькамі і дзеці ўдзельнічалі ў прыватызацыі, то важна вызначыць ступень удзелу кожнага члена сям'і ў набыцці гэтай кватэры, — нагадвае **адвакат Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 3 Анна КАРАНЕЎСКАЯ.** — Дастаткова звярнуцца да дагавора аб прыватызацыі, са зместу якога будзе зразумела, хто і якім чынам набываў кватэру. Як вынікае з пытання Аксаны, бацька памёр, значыць, пасля яго смерці адкрылася спадчына, якую яго ўдава і дзеці маглі прыняць як паводле завяшчання, так і па законе. Таму ў першую чаргу для таго, каб уступіць у дыялог з братам, Аксане неабходна вызначыць долю ў праве ўласнасці на кватэру кожнага з уласнікаў. Калі брат з сям'ёй не дадуць згоды на продаж кватэры трэцім асобам, з падзелам грашовых сродкаў прапарцыянальна долям у праве ўласнасці кожнага з іх, то можна разгледзець пытанне аб выплаце брату кампенсацыі за яго долю ўласнасці ў праве ўласнасці на кватэру, альбо, наадварот, прапанаваць яму выплаціць кампенсацыю за долю ў праве ўласнасці Аксане.

Калі ж сваякі не дамовяцца, то для вырашэння сітуацыі неабходна будзе звяртацца ў суд з іскам аб раздзеле жылога памяшкання, вылучаць долю ў праве ўласнасці кожнага ўласніка. Паколькі такі іск належыць да катэгорыі маёмасных спрэчак, то пры звяртанні з іскам у суд неабходна заплаціць дзяржаўную пошліну ў памеры 5% ад цаны іску, гэта значыць кошту долі, на якую прэтэндуе ісцец. У іскавай заяве можна паставіць на вырашэнне суда пытанне аб падзеле кватэры «ў натуры» — вылучэнні кожнаму ва ўласнасць долі, якая складаецца з ізаляванага жылога пакоя. Але варта адзначыць, што такі падзел кватэры немагчымы, калі пакоі не ізаляваны і тэхнічна не могуць быць ізаляваны (напрыклад, з'яўляюцца прахаднымі ці сумежнымі). У такой сітуацыі, пасля выдзялення кожнаму ўласніку долі ў праве ўласнасці на кватэру, кожны з іх мае права прадаць сваю долю. Але важна помніць, што калі адзін з уласнікаў жадае прадаць долю, то яму неабходна ўлічыць пераважнае права іншых уласнікаў на набыццё гэтай долі. Калі ж усе ўласнікі адмовіліся набыць прапанаваную да рэалізацыі долю, у такім выпадку яна можа быць прададзена трэцім асобам па меркаванні ўласніка.

І, нарэшце, хочацца адзначыць, што кошт доляў у праве ўласнасці на кватэру заўжды меншы, чым такая ж доля ў грашовым вымярэнні пры продажы кватэры як адзінага аб'екта права ўласнасці. Таму ў сітуацыі, якую апісала чытачка, кожнаму з уласнікаў варта як след падумаць, да чаго можа прывесці іх спрэчка, калі яны не дамовяцца

■ Фотаздымак з гісторыяй

ЛЮСТЭРКА ПАМЯЦІ З ДЗЕДАВАЙ ХАТЫ

«Сама я гісторык па адукацыі, займалася краязнаўствам і радаводам сваёй сям'і ад дзядоў да цяперашняга часу,— піша **Ларыса Макарэвіч з Нясвіжа.**— Сапраўды шмат здымкаў у сямейных альбомах, і гісторый — можа, на цэлы раман у фотаздымках».

А свой аповед Ларыса Віктараўна пачала з падзеі, 100-я ўгодкі якой гэтымі днямі адзначае ўвесь свет,— Першай сусветнай вайны. «Мой дзед па матчынай лініі, Усовіч Антон Фёдаравіч, быў удзельнікам гэтых падзей. З 1914 па 1917 гады служыў і ваяваў у царскай арміі радавым 25-га Сібірскага стралковага палка (на фота дзед — з белай хусцінкай у руцэ — са сваім аднапалчанінам). Атрымаў два раненні: у 1915 годзе — паранены ў грудзі, а ў 1916-м — агульная кантузія. Цікава, што захаваліся дакументы аб яго знаходжанні ў шпіталях Масквы і Тулы. Узнагарод не меў. Нягледзячы на раненні, дзед захаваў добрае здароўе, быў фізічна моцны, шмат працаваў на зямлі, не курыў і знаў меру ў тым, што ў чарцы,— можа, таму і пражыў да 90 гадоў.

Нарадзіўся ж дзядуля ў вёсцы Карцэвічы Нясвіжскага раёна ў 1893 годзе. Бацька яго памёр рана, таму, як старэйшы сын у сям'і, дзед Антон клапаціўся пра трох малодшых братоў (Сцяпана, Сяргея і Рыгора) і сястру Марыю, якую вельмі любіў і шанаваў. Зямлі сваёй у сям'і не было, займаліся конегадоўляй і пчалярствам. Апошні занятак, дарэчы, дзед не пакідаў да 85 гадоў. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся дадому, у 1921 годзе ажаніўся з Надзеяй з суседняга сяла Малева і перабраўся ў прымы да жонкі, бо цешча аддала зяцю добры кавалак зямлі. Маладая сям'я збудавала вялікі дом і шмат гаспадарчых памяшканняў. Дзед завёў каня, карову, авечак, свіней, птушку. Дзед Антон і баба Надзя выгадавалі чатырох дачок і мелі сямёра ўнукаў. Я — самая малодшая ўнучка — памятаю, калі прыязджалі на лета ў Малева, то з цікавасцю разглядалі сцены дома, увешаныя фотаздымкамі ў рамках. Даваеннымі, дзе маладыя дзед і бабуля, малыя цёткі і мама, сёстры-браты стрыечныя, шматлікая радня… Большасць фотаздымкаў захавалася і знаходзіцца цяпер у мяне, а вось хаты дзедавай ужо няма, толькі падмурак застаўся.

Мая мама і ўсе цёткі пакінулі вёску. Старэйшая Маня жыла ў Нясвіжы, бо ў 1948 годзе дзед пабудаваў тут хату (у ёй цяпер жыву я), працавала кастэлянкай у рэстаране і добра шыла адзенне. Сярэднія дочкі (Вольга, зубны ўрач, і Ірына, выхавальніца ў дзіцячым садку) апынуліся ў Косаве Брэсцкай вобласці. Малодшая Наташа (мая мама), настаўніца пачатковых класаў, працавала па размеркаванні ў вёсцы Волька, а потым пераехала ў вёску Бытань, таксама ў Брэсцкай вобласці; там сустрэлася з бацькам, ажаніліся, нарадзіліся брат і я…»

Нават не верыцца, што так хутка мінуў час, адзначае Ларыса Віктараўна. «Вось агульная сямейная картачка, зробленая напрыканцы 1950-х: у верхнім радзе цётка Вольга з мужам Міхаілам, мае бацькі Наталля і Віктар, Ірына з мужам Юрыем, а ў ніжнім — дзед Антон з унукамі Анатолем і Уладзімірам (дзеткі Вольгі) і Марыя з мужам Канстанцінам. Усе дочкі, зяці маладыя, прыгожыя, яшчэ даволі дужы дзед, старэйшыя ўнукі — зусім малеча. Цяпер жа тыя ўнукі самі пенсіянеры, а з цётак жывая толькі Вольга, якой пайшоў 90-ы год». Але традыцыя збірацца як мага большай колькасцю сваякоў і фатаграфавацца на памяць засталася, што засведчылі пазнейшыя здымкі — у 60-я, 80-я, 90-я — цяпер ужо з унукамі і праўнукамі дзеда Антона і бабы Надзі. Мабыць, так і ствараецца фоталетапіс кожнай сям'і, цікавейшы за любы падручнік па гісторыі?

***

Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.

Увага! *Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

«Жывая» вада — не для жывёл!

Вада, у якой купалі нованароджанага, у славянскіх народаў лічылася «жывой» або «жыватворнай», як і вада пасля абмывання нябожчыка — «мёртвай», здольнай нашкодзіць чалавеку. Таму існавала нямала правілаў яе выкарыстання і ўтылізацыі.

1 Вельмі непажадана было купаць малое (да года) дзіця пасля заходу сонца. Калі ўсё ж так атрымлівалася, то ваду пасля купання вылівалі толькі назаўтра раніцай. Непажадана таксама купаць немаўля ў той дзень тыдня, у які яно нарадзілася.

2 У вадзе, якая заставалася пасля купання дзіцяці, ні ў якім разе нельга было штосьці праць, выкарыстоўваць яе па гаспадарчым прызначэнні. Строга сачылі за тым, каб да гэтай вады не дакраналіся якія-небудзь жывёлы (сабака, кошка, карова і да т. п.).

3 Падчас купання дзіцяці, каб яго не сурочылі, не павінны прысутнічаць чужыя людзі.

4 Каб дзіця не было палахлівым, падчас купання стараліся не заходзіць і не глядзець на дзіця цераз галаву.

5 Каб вызначыць станоўчае месца для купання дзіцяці, арыентаваліся па баках свету: пажадана, каб падчас купання немаўлятка не ляжала галавой на захад.

6 Ва ўсходніх славян вішня сімвалізавала жаночую долю, цноту, каханне, таму існавала няпісанае правіла: пасля першага рытуальнага купання дзяўчынкі ваду вылівалі пад вішню, каб у будучым яна стала такой жа стройнай і прыгожай, як дрэва. На Палессі калісьці частку вады, у якой купалі дзяўчынку, вылівалі за парог, каб яна абавязкова выйшла замуж — «пайшла хутчэй». Ваду, у якой купалі хлопчыка, вылівалі пад яблыню — радаводнае дрэва ў культуры беларусаў, што сімвалізавала абавязковы працяг свайго роду і дабрабыт.

7 Катэгарычна забаранялася кідаць мокрыя пялёнкі і іншую дзіцячую вопратку на падлогу. Тлумачылі гэта так: дзіця ў маленстве будзе часта хварэць, а пасля — жыць у галечы.

Акрамя таго, у вадзе, у якой толькі што купалі дзіця, не дазвалялася мыцца іншым, асабліва пажылым людзям: лічылася, што стары чалавек будзе «амалоджвацца» (як у казцы пра маладзільныя яблычкі), а значыць, паздаравее; а дзіця стане хваравітым, хутка састарэе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

5 ФІЛЬМАЎ для сямейнага прагляду

Людміла ЯКІМЕНКА, правізар:

У час канікулаў, мне здаецца, лепш глядзець не доўгія кінастужкі (сучасных дзяцей і так ад тэлевізараў за вушы не адцягнеш), а невялікія і яркія мультфільмы. Гэта дазволіць і самому ў час бестурботнага дзяцінства акунуцца, і сваіх уласных дзяцей лепш зразумець. Мы ў сям'і стараемся больш глядзець савецкія і айчынныя мультфільмы — не ведаю, можа яны бліжэй па менталітэце.

1. «Трое з Прастаквашына». А таксама ўсе іншыя часткі пра вельмі самастойнага хлопчыка Дзядзю Фёдара, Шарыка і Матроскіна. Многім дарослым карысна бывае ўзгадаць, што нашы погляды на тое ці іншае пытанне таксама могуць быць памылковымі, а ў дзяцей пры жаданні шмат чаму можна навучыцца.

2. «Пластылінавая варона». Бадай, мой самы любімы мультфільм з дзяцінства. Яму ўжо больш за 30 гадоў, а сучасным дзецям таксама падабаецца і натхняе на ўласную творчасць. А мы, бацькі, між іншым, можам і пра байкі Крылова расказаць — ці пачытаць разам. І пафантазіраваць, якія мультфільмы можна было б зрабіць.

3. «Малыш і Карлсан». Чытала недзе, што гэты мультфільм хацелі забараніць. На маю думку, яго, наадварот, трэба паказваць абавязкова. Прычым сумесна бацькам і дзецям, каб можна было адразу абмеркаваць, што добра, а што дрэнна, што празмерна строгія выхавацелі ператвараюцца ў вачах дзіцяці ў «домамучыцеляў» і што сапраўдны сябар лепшы за сабаку, нават самага любімага і забаўнага. Што да шкадлівасці персанажа — дык хто з нас у дзяцінстве, скажам шчыра, заўжды быў белым і пушыстым?

4. «Брэменскія музыканты». Фактычна мультыплікацыйны мюзікл для дзяцей і дарослых. Хочаце — проста глядзіце, хочаце — падпявайце, хочаце — згуляйце потым з дзецьмі ў караля і атамана разбойнікаў. Мае, напрыклад, ставілі спектакль паводле гэтага мультфільма ў школе.

5. «Фіксікі». Я не вельмі люблю сучасныя мульцікі, але гэты — выключэнне, бо ён не толькі забаўны, але і карысны. Калі сучасныя «гарантыйныя чалавечкі» ў даступнай форме тлумачаць, што з чаго зроблена і якія правілы бяспекі трэба выконваць пры абыходжанні з тэхнікай, гэта даходзіць да дзяцей лепш, чым сто нудных лекцый ад мамы і таты.

МАМІНА КУХНЯ

ДАМАШНІЯ ГЛАЗУРАВАНЫЯ СЫРКІ

Калі вашы дзеці вельмі любяць гэты ласунак — тварожныя сыркі ў шакаладнай глазуры, а вас «грызуць» смутныя падазрэнні наконт іх тэрміну прыдатнасці, якасці і наогул саставу, раю прыгатаваць карысны і смачны дэсерт самастойна. Тым больш, зрабіць гэта зусім не складана.

Вам спатрэбяцца: шакалад без дабавак, лепш цёмны (колькасць какавы, у працэнтах, выбірайце на ўласны густ і зыходзячы з таго, ці ёсць у дзяцей алергія на гэты прадукт) — прыкладна 1,5 пліткі; цукровая пудра — 5 поўных чайных лыжак (можна нават з верхам), тварог — 2 пачкі па 200 грамаў, тлустасць на ваш густ. Можна дадаць 1/2 пачка масла або некалькі сталовых лыжак варанай згушчонкі, але ўлічвайце, што тады дэсерт будзе больш каларыйным. Для карысці, а таксама з мэтай заахвоціць малых «сюрпрызам унутры», раю дабавіць сухафрукты ці свежыя сезонныя ягады — чорныя парэчкі, чарэшні, суніцы, чарніцы і г. д.

Шакалад трэба растапіць у мікрахвалёўцы ці на вадзяной лазні. Добра змяшайце ім донца і бакі сіліконавых або металічных формаў (як для кексаў), можна ўзяць і форму сярэдняга памеру — і пастаўце ў маразілку на 5–7 хвілін ці ў халадзільнік, хвілін на 15–20. Пакуль формы астываюць, блендарам добра змяшайце тварог і цукровую пудру, туды ж дадайце масла, калі вырашыце яго скарыстаць. Калі формы застылі, напаўняем іх атрыманай масай. Унутр можна пакласці ягады, сухафрукты, наліць згушчонку, варэнне ці іншы напаўняльнік. Зверху наліваем і разраўняем рэшткі шакаладу, а потым зноў ставім у маразілку — прыкладна на 10–15 хвілін. Такія сыркі можна захоўваць замарожанымі, а перад «падачай» даць адтаяць пару хвілін пры пакаёвай тэмпературы. А вось у халадзільніку дэсерт захоўваецца не больш чым двое сутак, а лепш наогул з'есці яго на працягу аднаго дня.

ЯБЛЫЧНЫЯ АЛАДКІ

Мой малодшы сын і муж ну вельмі любяць есці бліны ва ўсіх варыяцыях: і зусім тоненькія блінцы з начынкай, і тоўстыя «з прыпёкам», і пышныя аладкі. А паколькі за кампанію з імі часта вячэраю і я, час ад часу «палягчаю» рэцэптуру і бяру ў якасці асноўнага складніка садавіну ці агародніну — кабачкі, гарбузы, капусту, грушы і яблыкі. З апошнімі прапаную прыгатаваць аладкі і вам.

Для яблычных аладак спатрэбяцца: 3–4 сярэднія яблыкі (лепш не вельмі салодкія і не рассыпістыя, з сакавітай мякаццю), 1 яйка, 2–3 сталовыя лыжкі цукру, дробка солі, мука, што называецца, на вока.

Яблыкі ачысціць ад сарцавіны і скуркі, падраць на буйной тарцы. Калі соку з іх атрымалася зашмат — лепш зліць і ўжыць яго асобна. Дадаць узбітае з цукрам яйка (можна яшчэ крыху ваніліну, карыцы, калі вашы дамашнія не супраць), добра перамяшаць. Муку трэба дадаваць паступова, каб цеста не атрымалася занадта густым. Яно павінна атрымацца, як і для звычайных аладак, падобным да не вельмі густой смятаны. Смажым таксама традыцыйна: лыжкай выкладваем на патэльню з алеем (яго, дарэчы, лепш дадаваць таксама зусім крыху, каб аладкі не выйшлі занадта тлустымі). Гатовая страва мае на дзіва тонкі, прыемны смак. У якасці соусу да яе можаце выкарыстаць і смятану, і варэнне, і марожанае — але маёй сям'і найбольш даспадобы натуральны ці салодкі ёгурт.

Смачна есці!

Юлія ІВАШЧАНКА, г. Мінск.

У народзе кажуць: ***«ШТО ДВОР, ТО НОРАЎ».***

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«НІ НАГОЙ!»

Чырвоны ўзровень небяспекі адступіць толькі напрыканцы наступнага тыдня

З-за спякотнага надвор'я і моцнага працяглага дэфіцыту ападкаў у Беларусі працягваюць гарэць лясы. А лакальныя непрацяглыя дажджы, якія адзначаюцца ў апошні час месцамі па краіне, істотна на сітуацыю не ўплываюць...

— Практычна па ўсёй краіне зараз устаноўлены 4 і 5 класы пажарнай небяспекі. Толькі з аўторка па сераду ў краіне ўзніклі 4 новыя пажары ў лясах і 14 — на тарфяніках, — паведамілі "Звяздзе" ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Узгаранні на іх асабліва небяспечныя з-за таго, што гарэнне адбываецца пад зямлёй, і таму патушыць яго вельмі цяжка. Самая ж трывожная сітуацыя ў краіне назіраецца па Гомельшчыне, Брэстчыне і поўдні Мінскай вобласці.

Мы нагадваем, што па ўсёй тэрыторыі краіны ўведзена поўная забарона на наведванне лясоў. У кожным выпадку яе прымаюць мясцовыя органы ўлады. Адмяняцца яна таксама будзе, зыходзячы з бягучага становішча. Усе шлагбаумы, якія знаходзяцца на з'ездах з дарог у лясы, мусяць быць зачынены. Аўтааматарам дазваляецца толькі праязджаць праз лес выключна па тых дарогах, якія вядуць да населеных пунктаў і ўладкаваных месцаў адпачынку.

Само сабой, паўстае пытанне: а як высветліць, ці адносіцца пэўная тэрыторыя да лясных угоддзяў, каб пазбегнуць неспадзяванага канфлікту з законам?

Спецыялісты раяць звяртацца ў такім выпадку ў мясцовыя лясгасы. Зрабіць гэта будзе карысна ў першую чаргу для вашага кашалька. Бо калі вы парушыце забарону на знаходжанне ў лесе, то за гэта мусіце сплаціць штраф у памеры да дваццаці пяці базавых. Аднак калі з-за вас лесу або тарфяніку быў нанесены ўрон, але складу злачынства ў гэтым не знайшлі, то сума штрафу ўзрастае ўдвая.

Але калі ж можна будзе спакойна выбрацца ў лес па грыбы, ягады або проста дзеля адпачынку?

— Каб ураторваць лясы ад магчымых пажараў, патрэбны зацяжныя дажджы па ўсёй краіне. А вось тут, на жаль, папярэдні прагноз пакуль не радуе, — гаворыць **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.** — Мяркуецца, што чырвоны ўзровень небяспекі будзе сёння абвешчаны на тэрыторыі Гомельскай вобласці, а да канца тыдня — па поўдні Магілёўшчыны і ў раёне Гродна... Так што да канца бягучага тыдня істотнага паляпшэння пажаранебяспечнай сітуацыі агулам па краіне мы не чакаем. Але разлічваем, што прырода усё ж злітуецца напрыканцы наступнага тыдня, калі пойдуць дажджы і дзённая тэмпература прыйдзе ў норму, якая складае 21-26 градусаў...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ На спёку дня

ЗАГАД: БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ І НАПАГАТОВЕ

У сувязі з анамальнай спёкай, якая зацягнулася, начальнік грамадзянскай абароны Мінска падпісаў загад, скіраваны на забеспячэнне бяспекі грамадзян і папярэджанне пажараў.

Ім, у прыватнасці, прадпісваецца старшыні Мінскай гарадской арганізацыі АСВОД арганізаваць разам з работнікамі міліцыі патруляванне зон масавага адпачынку з мэтай недапушчэння распіцця спіртных напіткаў каля вады, купання і выкарыстання плаўсродкаў у стане алкагольнага ап'янення. Дырэктару Мінскай лесапаркавай гаспадаркі прадпісана прыняць захады па забароне наведвання грамадзянамі лесапаркавых зон, выканаць мерапрыемствы па ўладкаванні мінералізаваных палос, выдаленні сухой расліннасці па межах жылых кварталаў, якія прылягаюць да лясных масіваў. Дырэктару КУП "Экарэс" — узмацніць кантроль за захаваннем правілаў пажарнай бяспекі і выкананнем тэхналагічных правілаў захоўвання цвёрдых бытавых адходаў. Начальнік Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі, кіраўнікі адміністрацый раёнаў, арганізацый, якія вядуць эксплуатацыю жыллёвага фонду, павінны арганізаваць кантроль за проціпажарным станам месцаў збору бытавога смецця на падведамасных тэрыторыях і г.д.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Май на ўвазе

ПАЧАТАК СЕЗОНА ПАЛЯВАННЯ ПЕРАНЕСЕНЫ

З другой суботы жніўня (з 9-га чысла) у краіне павінны быў распачацца сезон палявання на вадаплаўную і балотную дзічыну, вальдшнэпа, вехіра, шызага голуба, перапёлку і фазана.

Аднак з-за спякотнага і сухога надвор'я, якое ўстанавілася на тэрыторыі краіны, у шэрагу рэгіёнаў апошнімі днямі быў абвешчаны чацвёрты або пяты клас пажарнай небяспекі.

Каб папярэдзіць выпадкі ўзнікнення лясных пажараў, распараджэннем прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь №214 ад 5 жніўня 2014 года Міністэрству лясной гаспадаркі сумесна з аблвыканкамамі даручана забяспечыць перанос карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў тэрміну адкрыцця палявання на вадаплаўную і балотную птушку, вальдшнэпа, вехіра, шызага голуба, перапёлку і фазана на 23 жніўня.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Учынак

«МАГЛІ Б І НЕ ТАКОГА НАРАБІЦЬ»

Юнакі з Нясвіжа дапамаглі міліцыі затрымаць хуліганаў

На днях начальнік аддзела ўнутраных спраў Нясвіжскага райвыканкама падпалкоўнік міліцыі Сяргей Гук уручыў падзякі і грашовыя прэміі студэнту Беларускага інстытута правазнаўства Арцёму Мікітовічу і навучэнцу Нясвіжскага каледжа імя Якуба Коласа Арцемію Фянько за ўчынак, дастойны сапраўдных мужчын.

Арцемій ФЯНЬКО і Арцём МІКІТОВІЧ.

У адзін з ліпеньскіх вечароў сябры каталіся на веласіпедах у гарадскім парку. Тут жа своеасаблівым спосабам «забаўляліся» хлопцы, на гады два-тры старэйшыя за іх: пераварочвалі лаўкі, брыдкасловілі. Яшчэ больш прыкрасці іх дзеянні набывалі таму, што ў гэтым парку знаходзіцца брацкая магіла з Вечным агнём.

— Аднаго з хуліганаў мы ведалі, сустракалі ў Нясвіжы, а двух іншых бачылі ўпершыню. Мы з Арцёмам зрабілі ім заўвагу і запатрабавалі, каб яны паставілі лаўкі на ранейшае месца. Але яны не звярнулі на гэта ніякай увагі. І тады мы патэлефанавалі ў міліцыю, — распавёў Арцемій.

Супрацоўнікі міліцыі на званок адрэагавалі неадкладна. На месцы яны затрымалі двух правапарушальнікаў. Трэці паспеў уцячы, але недалёка... У аднаго з затрыманых знайшлі наркатычны сродак, да таго ж ён быў нападпітку. Ужо потым высветлілася, што парушальнік быў асуджаны ў непаўналетнім узросце за крадзеж.

— І вам не страшна было звязвацца з такой неадэкватнай кампаніяй, да таго ж старэйшай па ўзросце? — пацікавілася ў Арцемія.

— Мы не думалі ў той час пра гэта. Ды і відаць, кожны б на нашым месцы так паступіў, — сціпла адказаў ён. — Калі іх не спыніць, то маглі б яшчэ і не такога нарабіць.

Сапраўды, у парку каля палаца Радзівілаў адпачывае шмат гасцей, гараджан, вяртаюцца позна з работы жанчыны. І невядома, што б яшчэ для забавы прыдумалі вялікаўзроставыя бэйбусы.

Дадам, што Арцемій — будучы графічны дызайнер.

— Ён вельмі спартыўны хлопец, вядзе здаровы лад жыцця, захапляецца веласіпедным спортам, неаднойчы хадзіў у велапаходы рознай складанасці, — распавяла куратар групы Людміла Аляксееўна Карачун. — Абараняў ён і гонар школы на турыстычных злётах.

Яго сябар Арцём — з кагорты смелых і фізічна дужых юнакоў. Таму і пасябравалі, што ў іх шмат агульных інтарэсаў, і ў першую чаргу — спорт.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Залежным ад алкаголю...

СПРОБА ЗАВЯЗАЦЬ

29 жніўня Мінскі гарадскі наркалагічны дыспансер праводзіць чарговую акцыю па льготным лячэнні («кадзіраванні» і «падшываннi») мінчан, якія пакутуюць ад алкагольнай залежнасці. Важная ўмова для праходжання лячэння — устрыманне ад ужывання алкаголю 10 дзён. З'яўляцца трэба па адрасе: вул. Някрасава, 22, к. 1, а загадзя запісвацца па нумары 292 31 03.

Кадзіраванне (стрэсапсіхатэрапія). Уздзеянне на свядомасць і падсвядомасць чалавека паказана ўсім хворым на хранічны алкагалізм, якія жадаюць лячыцца і, галоўнае, вылечыцца. Тэрмін кадзіравання — індывідуальны. Ён можа складаць ад некалькіх месяцаў да 5 і нават больш гадоў. Проціпаказанні — алкагольны абстынентны сіндром, некаторыя віды чэрапна-мазгавых траўмаў, сардэчна-сасудзістая недастатковасць, некаторыя псіхічныя расстройствы, узрост пасля 60 гадоў.

Медыкаментозныя сродкі прызначаюцца для падаўлення жадання выпіць. Пасля на гэтым фоне праводзіцца псіхатэрапеўтычнае лячэнне або дадаецца іголкарэфлексатэрапія, унутрывенная азонатэрапія, плазмаферэз і інш.

Падшыўка. На падставе сенсібілізуючага прэпарата дысульфіраму створаны шэраг прэпаратаў — эспераль, сульфавідыят, антабус, тэтурам і інш. Пралангіраваная форма дысульфіраму ўводзіцца ўнутрывенна (у некаторых выпадках унутрымышачна). Ужыванне алкаголю на фоне дзеяння прэпарата патрабуе тэрміновага ўрачэбнага ўмяшання. Працягласць эфекту таксама залежыць ад гатоўнасці самога пацыента — ад 3 месяцаў да 5 і больш гадоў.

Проціпаказанні: каранарная хвароба, псіхічныя расстройствы, цукровы дыябет, цяжарнасць, міякардыт, востры гламеруліт.

Кадзіраванне і падшыўка на фізіялагічным і псіхалагічным узроўні вучаць арганізм успрымаць алкаголь як страшны яд. Нервовая сістэма выпрацоўвае адмоўны рэфлекс да спіртнога. Пасля сеанса нават нязначная доза алкаголю выклікае ваніты, галаўны боль, патлівасць, рэзкі сасудзісты калапс, парушэнне дыхання і сардэчнай дзейнасці.

Многія пацыенты прызнаюць такое лячэнне вельмі эфектыўным, аднак ёсць і такія, хто пагадзіўся пад ціскам сваякоў, а таму працэдура аказалася неэфектыўнай. Усё ж такі любая методыка лячэння алкагалізму — гэта не столькі панацэя, колькі шанц пераасэнсаваць сітуацыю і прыняць узважанае рашэнне. Таму нярэдка рэкамендуецца і наведванне сустрэч Ананімных Алкаголікаў. Наогул у справе перамагання залежнасцяў ніколі не трэба апускаць рукі — варта спрабаваць зноў і зноў. Але гэтыя спробы павінны быць па ўласным жаданні.

Святлана БАРЫСЕНКА

ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
31 ліпня 2014
Прозвішча Сушко С.А.
Подпіс

БЕЛАРУСБАНК

УТВЕРЖДЕНО
Протокол заседания
Наблюдательного совета
ОАО «АСБ Беларусбанк»
15.07.2014 № 46

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк Беларусбанк» сто семьдесят пятого – сто семьдесят седьмого выпусков

1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)

Наименование эмитента на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»);

наименование эмитента на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес

Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18;
телефон: (017) 3090433; телефон/факс: (017) 2222626;
e-mail: info@belarusbank.by.

3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций

Инвесторы, изъявившие желание приобрести облигации сто семьдесят пятого – сто семьдесят седьмого выпусков Банка (в дальнейшем именуемые совокупно «Облигации»), перечисляют Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940 в Банке, код 795 в соответствии с договором открытой продажи Облигаций.

Нерезиденты Республики Беларусь могут приобретать Облигации в соответствии с требованиями действующего законодательства Республики Беларусь.

4. Наименование периодического печатного издания, определенного эмитентом для раскрытия информации

Банк публикует в газете «Звязда» следующую информацию:

годовой отчет Банка за отчетный год – не позднее 25 апреля текущего года (годовой отчет за 2013 год опубликован 19.04.2014, № 73);

о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка – в течение 2-х месяцев с момента принятия такого решения;

сведения, подлежащие опубликованию в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

о внесенных изменениях в Проспект эмиссии облигаций сто семьдесят пятого – сто семьдесят седьмого выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемый «Проспект эмиссии») – в срок не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (в дальнейшем именуемым «Регистрирующий орган»).

5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента

Депозитарием эмитента является депозитарий Банка (Банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь, номер государственной регистрации Банка – 056, код депозитария Банка – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, действующий на основании специального разрешения (лицензии) Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089 сроком действия до 29.07.2022.

6. Размер уставного фонда эмитента

Уставный фонд Банка составляет 16 688 787 859 000 белорусских рублей.

7. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций

С Проспектом эмиссии можно ознакомиться в период открытой продажи Облигаций на официальном сайте Банка по адресу: http://belarusbank.by.

С копией Проспекта эмиссии можно ознакомиться в местах продажи Облигаций, указанных в пункте 11 настоящего документа, ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.

8. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и номинальная стоимость облигаций

Банк выпускает именные, бездокументарные, процентные, неконвертируемые Облигации:

№ выпуска	Объем эмиссии по номинальной стоимости	Количество облигаций, штук	Серия, номера Облигаций	Номинальная стоимость Облигации
175	100 000 000 (Сто миллионов) долларов США	100 000	ЖБ175, с 000001 по 100000	1 000 долларов США
176	100 000 000 (Сто миллионов) евро	100 000	ЖВ176, с 000001 по 100000	1 000 евро
177	1 000 000 000 (Один миллиард) российских рублей	1 000 000	ЖГ177, с 0000001 по 1000000	1 000 российских рублей

9. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям

Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» в пределах 80 процентов нормативного капитала Банка по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.

10. Период проведения открытой продажи облигаций

Банк проводит открытую продажу Облигаций с 11.08.2014 по 10.08.2015, если иной срок до окончания открытой продажи Облигаций не будет определен Правлением и Наблюдательным советом Банка. Период проведения открытой продажи Облигаций может быть сокращен также в случае полной реализации всего объема эмиссии Облигаций.

11. Место и время проведения открытой продажи облигаций

Размещение Облигаций осуществляется Банком путем их открытой продажи на внебиржевом рынке департаментом инвестиций и ценных бумаг центрального аппарата Банка (Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, тел. 3090433, факс 2222626), а также учреждениями Банка (филиалами-областными (Минским) управлениями, филиалами, центрами банковских услуг) на основании договоров открытой продажи Облигаций. Отделения Банка в размещении Облигаций не участвуют.

Список учреждений Банка размещен на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by/), а также в Проспекте эмиссии.

Время проведения продажи Облигаций – ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, в соответствии с регламентом работы соответствующего учреждения Банка.

12. Покупатели облигаций

Покупателями Облигаций могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели, резиденты и/или нерезиденты Республики Беларусь.

13. Порядок определения стоимости облигации при проведении открытой продажи облигации

В день начала открытой продажи Облигаций (11.08.2014), а также в даты выплаты процентного дохода Облигации продаются первому их собственнику по цене, равной номинальной стоимости Облигации. Даты выплаты процентного дохода, а также порядок определения таких дат, в случае если установленная дата выпадает на нерабочий день, указаны в пункте 18 настоящего документа.

В иные дни периода открытой продажи Облигации продаются по их текущей стоимости.

14. Срок обращения Облигаций – 1 826 календарных дней (с 11.08.2014 по 11.08.2019). Для расчета срока обращения Облигаций день начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

15. Дата начала погашения Облигаций – 11.08.2019. Дата окончания погашения Облигаций совпадает с датой начала погашения Облигаций.

16. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты

По Облигациям установлен постоянный процентный доход (в дальнейшем именуемый «доход»), выплачиваемый владельцам Облигаций периодически в течение срока обращения Облигаций.

Ставка дохода устанавливается в размере:

4 (Четырех) процентов годовых по облигациям сто семьдесят пятого – сто семьдесят шестого выпусков;

5,5 (Пяти целых пяти десятых) процентов годовых по облигациям сто семьдесят седьмого выпуска.

Доход выплачивается на основании реестра владельцев облигаций соответствующего выпуска (в дальнейшем именуемого «реестр») для целей выплаты дохода, сформированного депозитарием Банка, путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь причитающихся денежных средств в валюте номинала облигации соответствующего выпуска на счета владельцев Облигаций, являющихся таковыми по состоянию на дату закрытия реестра. Даты формирования реестра, а также порядок определения таких дат, в случае если установленная дата выпадает на нерабочий день, указаны в пункте 18 настоящего документа.

17. Период начисления дохода по облигации

Доход по Облигациям начисляется в период с 12.08.2014 по 11.08.2019 (с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату начала погашения Облигации) включительно.

Доход за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату его выплаты включительно. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (в последнем периоде – по дату начала погашения) включительно.

18. Даты выплаты дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода

Доход по Облигациям выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления дохода:

ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА				Дата формирования реестра для целей выплаты дохода
№ п/п	начало периода	конец периода, дата выплаты дохода	продолжительность периода, дней	
1	12.08.2014	11.11.2014	92	07.11.2014
2	12.11.2014	11.02.2015	92	07.02.2015
3	12.02.2015	11.05.2015	89	07.05.2015
4	12.05.2015	11.08.2015	92	07.08.2015
5	12.08.2015	11.11.2015	92	07.11.2015
6	12.11.2015	11.02.2016	92	07.02.2016
7	12.02.2016	11.05.2016	90	07.05.2016
8	12.05.2016	11.08.2016	92	07.08.2016
9	12.08.2016	11.11.2016	92	07.11.2016
10	12.11.2016	11.02.2017	92	07.02.2017
11	12.02.2017	11.05.2017	89	07.05.2017
12	12.05.2017	11.08.2017	92	07.08.2017
13	12.08.2017	11.11.2017	92	07.11.2017
14	12.11.2017	11.02.2018	92	07.02.2018
15	12.02.2018	11.05.2018	89	07.05.2018
16	12.05.2018	11.08.2018	92	07.08.2018
17	12.08.2018	11.11.2018	92	07.11.2018
18	12.11.2018	11.02.2019	92	07.02.2019
19	12.02.2019	11.05.2019	89	07.05.2019
20	12.05.2019	11.08.2019	92	07.08.2019
ИТОГО:			1826	

В случае если дата выплаты дохода выпадает на нерабочий день, фактическая выплата дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, установленные и объявленные Советом Министров Республики Беларусь, Президентом Республики Беларусь нерабочими днями.

В случае если дата формирования реестра для целей выплаты дохода выпадает на нерабочий день, фактическое формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

19. Условия и порядок досрочного погашения (аннулирования) облигаций

Банк может принять решение о досрочном погашении (аннулировании) облигаций сто семьдесят пятого и/или сто семьдесят шестого и/или сто семьдесят седьмого выпусков Банка либо части указанных выпусков (в дальнейшем именуемым «досрочно погашаемые облигации») в следующих случаях:

а) принятия соответствующего решения Правлением и Наблюдательным советом Банка. О данном решении Банк письменно уведомляет владельцев досрочно погашаемых облигаций не позднее 4 рабочих дней до установленной даты начала их досрочного погашения;

б) приобретения Банком Облигаций до даты окончания срока обращения Облигаций в порядке, определенном пунктом 21 настоящего документа.

Кроме того, Банк может принять решение об аннулировании Облигаций, не размещенных на момент принятия такого решения.

При досрочном погашении владельцам досрочно погашаемых облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также доход, рассчитанный с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату начала досрочного погашения включительно.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется Банком в отношении лиц, указанных в реестре, который формируется депозитарием Банка за 4 рабочих дня до установленной Банком даты начала досрочного погашения облигаций соответствующего выпуска, путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь причитающихся денежных средств в валюте номинала облигации соответствующего выпуска на счета владельцев досрочно погашаемых облигаций.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод досрочно погашаемых облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для досрочного погашения облигаций.

20. Порядок погашения облигаций

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иные неполученные доходы – при их наличии).

Погашение Облигаций осуществляется Банком в отношении лиц, указанных в реестре для целей погашения Облигаций, который формируется депозитарием Банка по состоянию на 07.08.2019, путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь причитающихся денежных средств в валюте номинала облигации соответствующего выпуска на счета их владельцев.

В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, определенный таковым в соответствии с пунктом 18 настоящего документа, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод погашаемых Облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

21. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения

В период обращения Облигаций Банк осуществляет приобретение Облигаций до даты начала их погашения с возможностью последующего обращения Облигаций (далее – выкуп):

- на биржевом рынке в соответствии с правилами ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа);

- на внебиржевом рынке в соответствии с заключенными договорами купли-продажи облигаций.

Выкуп осуществляется по цене, равной номинальной стоимости облигации соответствующего выпуска, в даты выплаты дохода по Облигациям, указанные в пункте 18 настоящего документа (за исключением последнего периода). Если установленная дата выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп облигаций соответствующего выпуска осуществляется Банком по номинальной стоимости в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты по выкупленным Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Кроме того, в период обращения Облигаций Банк имеет право:

приобретать Облигации в иные сроки (цену и количество приобретаемых Облигаций определяет Банк), начиная с 20.08.2014;

осуществлять дальнейшую реализацию или досрочное погашение выкупленных Облигаций;

совершать иные действия с Облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

22. Порядок обращения облигаций

Обращение Облигаций осуществляется на внебиржевом рынке и/или в торговой системе Биржи среди юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, резидентов и/или нерезидентов Республики Беларусь, в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

Сделки с Облигациями на вторичном рынке прекращаются за 4 рабочих дня до даты начала погашения Облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документа.

Первый заместитель Председателя Правления Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» **Г.С.Господарик**

Главный бухгалтер Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» **И.П.Лысоковская**

И.о директора Унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» (приказ от 30.06.2014 № 15/л) **М.Л.Максимович**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

1944-2014 70 гадоў вызвалення

НАСТОЛЬНЫЯ КНІГІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

Новыя выданні папоўнілі кніжную скарбонку музея Вялікай Айчыннай вайны

Нялёгкі год выдаўся для супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак, нягледзячы на ўсе складанасці, удалося не толькі своечасова пераехаць у новы будынак, але і падрыхтаваць экспазіцыю — адну з найбольш унікальных у Еўропе. Парадавалі музейшчыкі і друкаванымі выданнямі, якія ўбачылі свет напярэдадні 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Дырэктар музея Мікалай СКОБЕЛЕЎ уручае падарункавы асобнік вядучаму спецыялісту ўстановы Уладзіміру ФАЛЕЦКАМУ.

Дарэчы, адно з іх — каталог «Партызанская зброя» — выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Нагадаем, у кнізе ўпершыню публікуецца ўнікальная інфармацыя аб калекцыі самаробнай партызанскай зброі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Падобнай працы ў беларускай гістарыяграфіі ніколі не было. Больш за тое, не існавала такога каталога і на ўсёй постсавецкай прасторы. А ўсё таму, што сама калекцыя самаробнай партызанскай зброі з'яўляецца рарытэтнай у фондавых зборах музея. Аналагаў ёй няма ва ўсім свеце: 62 прадметы, і ні адзін з іх не паўтарае іншы!

Каталог «Партызанская зброя» адрасаваны гісторыкам і музейшчыкам, знаўцам збройнай справы і калекцыянерам, усім тым, хто хоча больш даведацца аб гісторыі савецкага партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны. Аўтары кнігі — ветэран музея Галіна Скарынка і былы супрацоўнік, магістр культуралогіі Сяргей Лапароў. Між іншым, па выніках 11-га Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД у намінацыі «Перамога» аўтары ўзнагароджаны дыпломам 1-й ступені, а сам твор у гэтай намінацыі стаў першым.

— У каталогу прадстаўлены абсалютна ўнікальныя канструкцыі майстроў-збройнікаў, — расказала **намеснік галоўнага захавальніка фондаў музея Галіна СКАРЫНКА.** — Мой калега, Сяргей Лапароў, нават класіфікаваў калекцыю самаробнай партызанскай зброі: зробленыя на аснове ППШ, пісталета-кулямёта Дзегцярова, пісталета-кулямёта Судаева, на аснове нямецкіх аўтаматаў... Менавіта згодна з гэтай класіфікацыяй, у каталогу размешчаны фотаздымкі экспанатаў. Побач — іх апісанні, тэматычныя малюнкі, успаміны майстроў-збройнікаў.

Сімвалічна, што напярэдадні святкавання знакавых дат музейныя супрацоўнікі падрыхтавалі і хранікальна-дакументальную кнігу «Вызваленне Беларусі: хроніка, падзеі, героі». Падчас працы над выданнем аўтары-ўкладальнікі выкарыстоўвалі аператыўныя зводкі Саўінфармбюро, загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, дакументы Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху, архіўныя матэрыялы фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, фотаздымкі і рэпрадукцыі плакатаў ваенных гадоў.

— Унікальнасць кнігі заключаецца ў тым, што тут упершыню ў гістарыяграфіі апісаны ўсе 306 дзён, на працягу якіх вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, — зазначыў **памочнік дырэктара музея Мікалай ШАЎЧЭНКА.** — Кожны з гэтых дзён, пачынаючы з 23 верасня 1943 года, калі быў вызвалены першы населены пункт Камарын, і заканчваючы вызваленнем Брэста 28 ліпеня 1944 года, пададзены праз баявыя дзеянні вайскоўцаў Чырвонай Арміі, беларускіх партызан і падпольшчыкаў. Упершыню ў творы закранаюцца малавядомыя тэмы: «лясныя» дзіцячыя школы ў партызанскіх атрадах і пасяўная 1944 года. Лічу, што яны ўпрыгожылі кнігу, хоць цэнтральнае месца тут, вядома, займае Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён».

Дарэчы, усе дакументы, якія змяшчаюцца ў выданні, — уласнасць музея Вялікай Айчыннай вайны. Дакументальнасць выкладзеных фактаў падмацоўваецца ўспамінамі і мемуарамі такіх савецкіх военачальнікаў, як Жукаў, Ракасоўскі, Васілеўскі, Баграмян, Батаў, а таксама яркіх арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі: Панамарэнкі, Калініна, Мазурава, Мачульскага і іншых. З кніжных старонак да чытачоў звяртаюцца і вядомыя беларускія паэты: Янка Купала, Якуб Колас, Пятро Глебка, Максім Танк, Ніл Гілевіч, Пятрусь Броўка.

Як падкрэсліў **дырэктар музея Мікалай СКОБЕЛЕЎ**, хранікальна-дакументальная кніга прызначана для таго, каб нашы дзеці і ўнукі падрабязна ведалі аб подзвігах і падзеях суровага ваеннага часу, а героі вайны не былі забыты нават праз шмат гадоў. «Спадзяёмся, што выданне зойме пачэснае месца сярод прац аб Вялікай Айчыннай вайне, стане добрым падарункам ветэранам, настольнай кнігай патрыятызму для падрастаючага пакалення», — перакананы кіраўнік установы.

З лістапада мінулага года Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сумесна з газетай «Во славу Родины» распачаў праект «Вызваленне Беларусі: хроніка, падзеі, героі». На старонках ваеннага выдання рэгулярна змяшчаліся матэрыялы аб важнейшых падзеях падчас вызвалення і гераічных дзеяннях вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў. На аснове гэтых публікацый і быў створаны хранікальна-дакументальны зборнік «Дарогамі вызваленцаў».

На гэтым супрацоўнікі музея спыняцца не збіраюцца. Для творчасці магчымасці вельмі шырокія. Як прызнаюцца самі музейшчыкі, рэзервы невычарпальныя. Толькі адных калекцый у музеі 23! Хоць па кожнай з іх стварай кнігу ці каталог. Напярадзе — вельмі шмат працы. Тым больш, 22 кастрычніка Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны спаўняецца 70 гадоў, а ў маі мы разам з многімі краінамі адсвяткуем 70-годдзе Вялікай Перамогі.

Да гэтых знакавых падзей супрацоўнікі музея рыхтуюцца загадзя. Ёсць ужо і канкрэтныя задумы. Запланавана выданне буклета і даведніка па музеі, выпуск хранікальна-дакументальнага альбома. Маляўнічага, з вялікай колькасцю ілюстрацый, якія дапамогуць наглядна прасачыць усе этапы развіцця і станаўлення музея. Акрамя таго, убачыць свет каталог калекцыі жывапісу «Палітра памяці» — каля 500 карцін, напісаных мастакамі-франтавікамі падчас вайны і ў мірны час. Адна з задум — расказаць пра Вялікую Перамогу ў экспанатах музея.

...Ну, што ж, плёну ў творчасці, а мы — у прадчуванні новых адкрыццяў!

Вераніка КАНЮТА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА



ПРЫГОЖЫ стары парк у райцэнтры Акцябрскі стаў сёлета месцам цікавых сустрэч для юных аматараў чытання. Такі падарунак зрабілі супрацоўнікі дзіцячага аддзела раённай бібліятэкі тым, хто ў час летніх канікул не забыўся на кнігу. Навінкі мастацкай літаратуры, творы з школьнай хрэстаматыі, свежыя часопісы — усё гэта дастаўляецца з кнігасховішча на цяністую алею побач з дзіцячай пляцоўкай. Клопатаў у супрацоўнікаў бібліятэкі прыбавілася, але і задавальнення ад сваёй працы стала больш. Бо разумная кніга павінна быць побач з маленькімі чытачамі нават у час адпачынку.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

СУСТРЭНЕМСЯ З КНІГАЙ У ПАРКУ

НА ЗДЫМКАХ: Пяцікласніца Ангеліна МАЛАДЗЯНАВА ўпадабала пазнавальную тэматыку. Кніжку з рук любімага казачнага героя можна атрымаць у лялечным аб'яднанні «Церамок», якое створана пры бібліятэцы. Бібліятэкар Таццяна ШЧЭЦЬКА з юнымі чытачамі.

■ Будзь у курсе!

ВІЗА З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ

Пасольства Італіі ў Мінску ўвяло новую паслугу — дастаўку пашпартоў з візай на дом

Дзякуючы новаму сэрвісу заяўнікам, якія плануюць паездку ў Італію, цяпер не трэба паўторна наведваць пасольства, каб забраць свой дакумент. Гэта асабліва актуальна для беларусаў, якія былі вымушаны прыязджаць у сталіцу з рэгіёнаў, сем'яў з дзецьмі, а таксама для вельмі занятых людзей. Заказваючы паслугу па дастаўцы пашпарта на дом, заяўнік, у першую чаргу, эканоміць свой час і сродкі на дарогу.

Па словах першага сакратара Пасольства Італіі ў Мінску Уга Боні, месячны выпрабавальны тэрмін новы сэрвіс паспяхова прайшоў.

— Мы пастаянна адсочвалі працэс дастаўкі пашпартоў з візамі атрымальнікам на дом і пераканаліся ў яго бесперабойнай рабоце. Таму сёння можам з упэўненасцю сцвярджаць, што гэтая паслуга з'яўляецца надзейнай, зручнай і хуткай, — падкрэсліў прадстаўнік пасольства. — Больш за 100 грамадзян ёй скарысталіся і засталіся задаволеныя...

Істотнае скарачэнне чакання — яшчэ адна з пераваг новага сэрвісу: пашпарт з візай адпраўляецца да атрымальніка на наступны пасля падачы дакументаў дзень. Улічваючы, што максімальны тэрмін дастаўкі дакументаў па Рэспубліцы Беларусь складае два дні, пашпарт вяртаецца да свайго ўладальніка праз тры—чатыры дні пасля падачы дакументаў на візу.

За забеспячэннем якасці гэтай паслугі сочыць упаўнаважаны супрацоўнік пасольства, які дапамагае заяўнікам запоўніць бланк перасылкі, уласна адпраўляе пашпарт і курыруе яго дастаўку да атрымальніка.

Кошт паслугі складае 100 тысяч беларускіх рублёў. Прычым кошт дастаўкі не залежыць ад колькасці пашпартоў, якія адпраўляюцца атрымальніку. Напрыклад, калі ў Італію едзе сям'я з трыма дзецьмі, то кошт перасылкі дакументаў усё роўна складае 100 тысяч рублёў.

Дыпламат падкрэсліў, што Пасольства Італіі ў Мінску гарантуе максімальную абарону пашпартоў, якія абслугоўваюцца, пры іх дастаўцы на дом.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Рэйтынгі

БДУ — СЯРОД ЛЕПШЫХ

Днямі была апублікавана чарговая рэдакцыя сусветнага вебаметрычнага рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities. Рэйтынг ахапіў дзейнасць 22 тысяч вышэйшых навучальных устаноў, а ўсяго ў свеце налічваецца зараз каля 30 тысяч ВНУ. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў 673-е месца і ўвайшоў у 3% найлепшых універсітэтаў свету.

Гэты рэйтынг ужо 11 гадоў складаецца іспанскай даследчай лабараторыяй «Laboratorio de Internet» і абнаўляецца двойчы на год: у студзені і ліпені. Як правіла, вышэйшыя навучальныя ўстановы ранжыруюцца па чатырох крытэрыях, якія характарызуюць узровень навуковых публікацый і прысутнасць (бачнасць) універсітэтаў у інтэрнэце.

Апошнія тры гады, паводле Webometrics, Белдзяржуніверсітэт стабільна ўваходзіць у тры працэнты лепшых універсітэтаў свету. Так, напрыклад, у ліпені 2011 года БДУ займаў 1208-е месца ў свеце, у ліпені 2013 года — 790-е, а ў студзені 2014 года — 881-е.

Сярод краін СНД БДУ стабільна ўваходзіць у пяцёрку лепшых ВНУ, саступаючы толькі чатыром расійскім універсітэтам: МДУ імя М. Ламаносава, Новасібірскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, Санкт-Пецярбургскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту і Нацыянальнаму даследчаму ядзернаму ўніверсітэту МІФІ.

А сярод беларускіх ВНУ Белдзяржуніверсітэт захоўвае першынство. За ім ідуць Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, які размясціўся ў агульным рэйтынгу на 1973 радку, і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, які займае 2154 пазіцыю.

А на вяршыні п'едэстала традыцыйна размясціліся Гарвардскі ўніверсітэт, Масачусецкі тэхналагічны інстытут і Стэндфардскі ўніверсітэт.

Варта адзначыць таксама поспехі на сусветнай арэне Электроннай бібліятэкі БДУ. Па звестках рэйтынгу, яна — першая сярод бібліятэк ВНУ краін СНД, увайшла ў сотню лепшых сярод аналагічных структур еўрапейскіх універсітэтаў (66-е месца) і размясцілася на 114-м месцы ў свеце.

Фундаментальная бібліятэка БДУ адна з першых у Беларусі распачала работу па рэгістрацыі ў сусветных базах даных поўнатэкставых навуковых публікацый, вучэбных і метадычных матэрыялаў вучоных і выкладчыкаў універсітэта, а таксама часопісаў, якія выдаюцца ў БДУ. Сёння электронная бібліятэка БДУ змяшчае больш як 60 000 арыгінальных поўнатэкставых публікацый, аўтарства якіх належыць супрацоўнікам БДУ.

■ Ведай нашых!

ПА МЕДАЛІ НА КОЖНАГА

Зборная беларускіх студэнтаў у складзе чатырох чалавек заваявала чатыры медалі рознай вартасці на XXI Міжнароднай студэнцкай алімпіядзе па матэматыцы ІМС—2014.

З залатымі ўзнагародамі вярнуліся з Балгарыі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ чацвёртакурснік Уладзіслаў Сатанеўскі і пяцікурснік Аляксандр Казлоў. «Бронза» — у студэнта ФПМІ БДУ Аляксандра Некрашэвіча і студэнта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Вячаслава Мурашкі.

Рыхтаваў беларускую зборную дацэнт кафедры функцыянальнага аналізу механіка- матэматычнага факультэта БДУ Алег Яблонскі, які ўжо працяглы час трэніруе студэнтаў для ўдзелу іх у розных міжнародных спаборніцтвах.

У гэтым годзе ІМС—2014 сабрала больш як 320 студэнтаў з 73 універсітэтаў свету. Маладым даследчыкам трэба было прайсці два раўнды працягласцю па 5 гадзін кожны. Задачы ахоплівалі такія раздзелы вышэйшай матэматыкі, як матэматычны і функцыянальны аналіз, тэорыя функцый комплекснай пераменнай, лінейная і абстрактная алгебра, геаметрыя і камбінаторыка. Але, акрамя матэматыкі, студэнтам трэба было яшчэ і ведаць англійскую мову, паколькі ўсе задачы былі сфармуляваны на ёй.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Будзь у курсе

ЯК У «ЗВЯЗДЗЕ» ДА ПІЦЕРА ТАННЕЙ ДАЕХАЦЬ?

Беларуская чыгунка і ААТ «Расійская чыгунка» пашыраюць галіну выкарыстання спецыяльных тарыфаў на перавозку пасажыраў асобнымі цягнікамі ў зносінах Беларусь — Расія.

Так, у міжнародных пасажырскіх цягніках Брэст — Санкт-Пецярбург, Мінск — Санкт-Пецярбург, Гродна — Масква, Брэст — Новасібірск, Гомель — Адлер, Масква — Мінск, Санкт-Пецярбург — Брэст, Новасібірск — Брэст у залежнасці ад тэрмінаў (глыбіні) продажу да кошту праезду ў вагонах усіх тыпаў, за выключэннем агульных, устанаўліваецца: 15-працэнтная зніжка — пры ўмове продажу білетаў у перыяд ад 60 да 31 сутак да адпраўлення цягніка; 10-працэнтная зніжка — пры ўмове продажу ў перыяд ад 30 да 21 сутак да адпраўлення цягніка.

Напрыклад, распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, калі набыць білет за 60-31 суткі да адпраўлення на фірменны цягнік №52 Мінск — Санкт-Пецярбург «Звязда», дык праезд у ім да Санкт-Пецярбурга ў вагоне «СВ» стане таннейшым на 250 тысяч рублёў, у купэйным вагоне — на 130 тысяч, у плацкартным — на 70 тысяч рублёў. Трэба толькі памятаць, што ўказаныя тарыфныя планы не дзейнічаюць пры афармленні праязных дакументаў у межах Беларусі, а таксама пры перавозцы арганізаваных груп пасажыраў.

Сяргей РАСОЛЬКА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков на право заключения договора аренды

1	Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	Аукцион состоится 09 сентября 2014 г. в 11.00, по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»		
2	Срок приёма документов	с 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 04 сентября 2014 года		
3	Номер лота	1	2	3
4	Адрес земельного участка	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, проезд Красный (район ремзавода)	Гомельская область, Жлобинский район, Кировский с/с, аг. Кирово, пер. Советский, 8	Гомельская область, Жлобинский район, Лукский с/с, аг. Лукский, ул. Социалистическая
5	Кадастровый номер участка	321850100001002217	321881604601000292	321882806101000158
6	Площадь, га	0,0600 га	0,0900 га	0,0060 га
7	Целевое назначение	для размещения объекта административно-торгового назначения, общественного питания (размещение объектов иного назначения)	для строительства и обслуживания магазина (размещение объектов розничной торговли)	для установки торгового павильона (размещение объектов розничной торговли)
8	Срок аренды	10 лет	10 лет	50 лет
9	Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия	Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ)		
10	Условия и ограничения	1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона (либо признания аукциона несостоявшимся): - внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); - возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков; 2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Жлобинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав на земельный участок; 3. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку проекта благоустройства территории, в сроки определенные законодательством; 4. приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации; 5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации; 6. завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документации.		
11	Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учётом нагрузок, определённых при разработке ПСД.		
12	Начальная стоимость, рублей	27 802 842	555 358	22 900
13	Сумма задатка, рублей	2 780 284	55 536	2 290
14	Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей	9 678 419	10 282 065	10 081 804
15	Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей	1 000 000	1 000 000	1 000 000

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008г. № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене.

По заявлению победителя аукциона местным исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в местный исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за предмет аукциона принимается местным исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона заключает с ним договор аренды земельного участка, передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

3. Если аукцион признан несостоявшимся в связи с тем, что заявление на участие в нем подано только одним участником, земельный участок предоставляется этому участнику при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, с выдачей ему в день признания аукциона несостоявшимся копии протокола о признании аукциона несостоявшимся.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) **в срок по 04 сентября 2014 года (с 9.00 до 17.00)** подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключается с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, Организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копи свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1).

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре.

Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

Прышчэпка вочкам, ці акуліроўка (ад лацінскага «акулус» — вока), азначае акультурванне дзічкі-прышчэпы шляхам прышчэпкі да яе часткі культурнага дрэва — падшчэпа — у выглядзе спячай пупышкі, або вочка.

АКУЛІРОЎКА ПЛАДОВЫХ ДРЭЎ

Найбольш прыдатным часам для прышчэпкі вочкам з'яўляецца канец ліпеня — пачатак жніўня. І прышчэп, і падшчэп павінны быць спелымі. Гэта значыць, што драўніна ў іх ужо дравяністая, ломкая, прычым кара добра адыходзіць ад драўніны. Гэта звязана з так званым перыядам восеньскага руху соку.

Падшчэп пажадана браць з кроны даросла-га дрэва. У якасці падшчэпа заўсёды бяруцца аднагадовыя парасткі, прырост гэтага года, які пасля адпаведнай апрацоўкі атрымлівае назву чаранок. Прыдатнасць парастка для акуліроўкі можна вызначыць візуальна: ён саспеў, калі скончыўся яго рост і канчатковая пупышка добра сфарміравалася. Для прышчэпкі выкарыстоўваюць не ўсе вочкі чаранка-падшчэпы. Тры-чатыры вочкі ў ніжняй частцы звычайна бракуюць. І верхнія вочкі, як слаба выспелыя, занадта далікатныя.

Для прышчэпкі ўжываецца спецыяльны, так званы акуліровачны нож. Ён павінен быць добра навостраны і вельмі чысты. Перад прышчэпкай «дзічок» трэба падрыхтаваць. Каб у дзічкі лепш адыходзіла кара, варта адзін-два разы добра паліць, што звычайна выклікае ажыўленне руху соку. За некалькі дзён да прышчэпкі ачысціць ніжнюю частку штамба ад бакавых парасткаў. Перад самой жа прышчэпкай, папярэдне страсянуўшы дрэўца, варта абмыць ці абцерці сырой анучай ніжнюю частку штамба, каб выдаліць пыл.

Увага. *Вопыт паказвае, што пранікненне пылу пад вочка, якое прышчапляецца, з'яўляецца адной з самых распаўсюджаных прычын няўдачы акуліроўкі.*

ТЭХНІКА ПРЫШЧЭПКІ ВОЧКАМ



Працэс акуліроўкі заключаецца ў наступным: на дзічцы робяць Т-падобны надрэз. Адным рухам здымаюць шчыток і, асцярожна адсунуўшы лязом нажа край надрэзанай кары, устаўляюць шчыток.

Паміж драўнінай і карой у расліны ёсць тоненькая праслойка — «камбій». Нам важна, каб вочка трапіла пад кару прышчэпы і камбіяльныя пласты прышчэпы і падшчэпы абавязкова сутыкнуліся. Пасля таго як вочка ўстаўлена, трэба адразу ж зрабіць абвязку. Для гэтага выкарыстоўваецца спецыяльная акуліровачная стужка, якую можна замяніць харчовай поліэтыленавай плёнкай.

ЗРАЗАННЕ ШЧЫТКА З ЧАРАНКА



Вышэй за вочка, прыкладна на адзін сантыметр, робяць невялікі надрэз кары, а затым, не аднімаючы нажа, паварочваюць яго плаўным рухам управа і зразаюць шчыток. Пры падыходзе нажа да самога вочка лязо злёгку заглыбляецца ў чаранок невялікім паваротам яго, каб зрэзаць сасудзіста-валакністы пучок, які і сілкуе пупышку. Надайце гэтаму асаблівую ўвагу. Калі ў гэтым месцы лязо нажа не заглыбіць, то шчыток зрэжацца няправільна. Давёўшы зрэз прыкладна на 1 сантыметр ніжэй за пупышку, аднімаюць шчыток, прытрымліваючы кару чаранка вялікім пальцам левай рукі і пераразаючы ў той жа час кару каля шчытка ў патрэбным месцы на 1 сантыметр ніжэй за вочка. Зняты шчыток прытрымліваецца на лязе нажа вялікім пальцам правай рукі і перадаецца адразу ў левую руку. Затым трэба ўставіць шчыток у разрэз кары на прышчэпе.

Зрэзаны з матачнага дрэва парастак трэба адразу ж ачысціць ад лісця, бо яно моцна выпарваючы ваду, можа хутка зрабіць чаранок непрыдатным для акуліроўкі. Пакідаюць для прышчэпкі вочкам толькі частку хвосціка, каб падчас працы было за што трымаць шчыток (шчытком называецца тая частка кары, якая зразаецца з вочкам). Зрэзаны і падрыхтаваны чаранок трэба захоўваць у вільготным месцы або апусціць зрэзам у вядро з невялікай колькасцю вады на дне.

МЕСЦА АКУЛІРОЎКІ

Прышчэпка вочкам павінна рабіцца як мага бліжэй да глебы (на вышыні 5-7 сантыметраў ад каранёвай шыйкі). У гарачае надвор'е варта зацяняць месца прышчэпкі, напрыклад, якім-небудзь лістом.

Пры вельмі нізкай акуліроўцы аперыраваны ўчастак карысна прысыпаць зямлёй, абганяючы дрэўца. Гэта засцерагае месца прышчэпкі ад шкоднага выпарваючага ўздзеяння сухога паветра і гарачых сонечных прамянёў. Вельмі важна засцерагчы ад гэтага расліну ў першыя дні пасля прышчэпкі. Па той жа прычыне прышчэпку імкнуцца рабіць з паўночнага боку.

Дзічку пасля прышчэпкі варта ўкараціць, каб такім чынам прымусіць дрэўца адкладаць пажыўныя рэчывы ў ніжняй частцы прышчэпы, а не пераганяць іх цалкам у верхнюю частку, якая расце.

Для яблыні і грушы праз 12-15 дзён, а для костачкавых парод (слівы, вішні, чарэшні і іншыя) праз 20-25 дзён — праводзяць рэвізію прышчэпак, абвязку злёгку аслабляюць.

Як выглядае прышчэпленае вочка, калі акуліроўка прайшла ўдала і зрастанне працякае нармальна?

Звычайна такое вочка захоўвае свежы выгляд, кара на шчытку мае карычневую або зялёную афарбоўку. Хвосцік, наадварот, паскорана заканчвае вегетацыю і прымае выгляд, які ён атрымаў бы нармальна толькі ў дні лістапада.

На пупышкавай падушцы (гэта значыць, у месцы злучэння хвосціка з парасткам) утворыцца коркавы пласт. Хвосцік трохі прывядае.

Пры дакрананні да яго ён адразу адпадае, агаляючы пупышкавую падушку. Такое адпадзенне хвосціка — дакладная прыкмета нармальнай прыжывальнасці вочка.

Калі хвосцік моцна сядзіць на сваім месцы і не адпадае пры дакрананні да яго, гэта значыць, што акуліроўка прайшла няўдала, шчыток засох разам з хвосцікам. У такіх выпадках дзічку прышчапляюць другі раз.

Акуліраваны ўчастак на дзічцы вельмі адчувальны да ўсякіх знешніх неспрыяльных уплываў. І зімовыя маразы, і рэзкія перамены надвор'я шкодна адбіваюцца на ім.

Засцерагчы дзічку ад гэтых шкодных уплываў можна простым спосабам: вочка засыпаюць зямлёй на 4-5 сантыметраў. Гэта засцерагае яго не толькі ад уплыву неспрыяльнага надвор'я, але і ад грызуноў — зайцоў і асабліва мышэй, якія звычайна пашкоджваюць каляземную частку маладых яблынь. І такім чынам часта абгрызаюць акуліроўкі.

ПРЫЧЫНЫ НЯЎДАЛЫХ АКУЛІРОВАК

Акуліроўка часам не ўдаецца. Гэта здараецца нават тады, калі мы бяром толькі сярэдняга ўзросту, найбольш жыццяздольныя пупышкі.

Акрамя забруджвання вочка, таго, што адбываецца ад неакуратнай, неахайнай працы, дрэнныя вынікі дае слабая абвязка вочка. Пры слабай абвязцы не ствараецца неабходнага зрастання шчыльнага прылягання кары падшчэпы да драўніны дзічкі. У выніку пад кару пранікае паветра, хваробатворныя мікробы, рух соку не аднаўляецца, і вочка адмірае.

Недапушчальная і занадта тугая завязка, калі абвязвальны матэрыял уразаецца ў кару і разбурае тканіны, асабліва ў слабавыспелых вочкаў.

Часта рэкамендуюць дзён праз 15 пасля акуліроўкі аслабіць завязку. Такое паслабленне вельмі часта прыводзіць да выпадзення прышчэпак. Гэта і зразумела.

Раптоўнае змяненне ціску на аперыраваны ўчастак праз два-тры тыдні пасля акуліроўкі, натуральна, павінна пацягнуць за сабой адмоўныя наступствы, бо за гэты час зрастанне не магло быць дастаткова трывалым. Пры гэтым розныя выпадковыя абставіны (напрыклад, залішняя сухасць паветра, высокая тэмпература, разгойданне дрэўца моцнымі парывамі ветру і іншыя) таксама могуць аказаць шкоднае ўздзеянне.

Аслабляць абвязкі восенню варта толькі ў тым выпадку, калі пры ранніх тэрмінах акуліроўкі асабліва спрыяльнае надвор'е выклікае ўзмоцненае разрастанне падшчэпы.

УСТАЎКА ШЧЫТКА Ў Т-ПАДОБНЫ РАЗРЭЗ

Лязом нажа злёгку адварочваюць край кары і ўсоўваюць шчыток, трымаючы яго за кончык хвосціка. Пасля ўстаўкі шчытка праводзяць указальнымі пальцамі правай і левай рукі знізу ўверх па краях надрэзу, шчыльна прыціскаючы іх да ўстаўленага шчытка, і робяць абвязку плёнкай.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

САМЫЯ ЗНАЧНЫЯ ВЫНІКІ



Іх паказалі беларускія складальнікі ў чэмпіянаце свету-1 па шашачнай кампазіцыі ў раздзеле камбінацыйных праблем-64. Яны заваявалі ўсе тры медалі: залаты — Пётр Шклудаў з Наваполацка (на фота), сярэбраны — Аляксандр Кагоцька (Бабруйск) і бронзавы — вядучы звяздоўскай рубрыкі. Нядаўна ім уручаны ўзнагароды, а таксама адпаведныя дыпломы ФМЖД.

Чэмпіён працягвае радаваць паклоннікаў свайго таленту паспяховымі выступленнямі ў спаборніцтвах высокага рангу. Наступная яго задумка заслужыла 77,33 ачка і перамагла ў катэгорыі В міжнароднага конкурсу «Пінск-2013»:



Белыя: a3, b6, c1, c7, d6, e5, e7, f6, g1, g7, h6 (11). **Чорныя:** a5, a7, b2, b4, b8, c3, c5, d2, d4, e3, f2, h8 (12). Галоўны варыянт: ed8, c5 (f4) a3 (c7) a5 (b6) a5:c7:e1, f4, b4, g7 (b4) h6 (a3) c1 (b6) f2 (c5) fe3 (b4) d4+.

ТРЭЦІ ТУР

Яго заданні падрыхтаваны да конкурсу «Пагода ў доме-10». У іх традыцыйна белыя пачынаюць і выйграюць:



№ 7. Белыя: a7, b6, d4, e5, f6, g7, h6 (7). **Чорныя:** a3, b2, b4, c3, d2, d8, h4 (7).

№ 8. Белыя: d2, e1, e3, f4, g3, g5, h4 (7). **Чорныя:** a3, b4, b6, c5, d6, e7, h2, h8 (8).

№ 9. Белыя: c7, d6, e3, e7, g5 (5). **Чорныя:** a7, b2, b4, c5, f6, f8, g3 (7).

Таму, хто з імі справіцца, будуць залічаны і папярэднія заданні. Так што яшчэ не позна ўключыцца ў конкурс. Нагадваем яго асноўныя ўмовы: праводзіцца ён пад эгідай калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі; падрыхтаваны 24 заданні, кожнае з іх ацэньваецца ў адно ачко. Пераможцы конкурсу пацвердзяць свой высокі рэйтынг першакласных рашальнікаў альбо папоўняць іх рады, яны, а таксама суддзя спаборніцтва і лепшая рашальніца будуць адзначаны.

❍ ❍ ❍

Адказы на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

«Пагода ў доме-10» (М. Грушэўскі): **№ 1.** d8, c7, h6, c1, f6, f8x, **№ 2.** de7 (b:f4) d8, e7, h6, f8x і **№ 3.** dc7, a1, f4, e1x.